КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №20 (148)
◂ 5 ЧЭРВЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час




**GAME OVER,
або КРАЙ НІЯКІХ ТАЛЕРАЎ**

Стар. 5

**ГІСТОРЫЯ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ**

У падобным на прыватны дзіцячы садок будынку ў прыгарадзе Мінска дзетак вучаць асэнсоўваць і прымаць смерць, але найперш — жыць. Не зважаючы на тое, што многім з іх на жыццё лёс адмераў зусім мала часу

Стар. 6

**ІХ НОРАВЫ**

Былы зяць прэзідэнта Казахстана Рахат Аліеў апублікаваў скандальную кнігу пра сакрэты назарбаеўскага двара. Прапануем некаторые ўрыўкі з яе, якія тычацца асабістага жыцця Назарбаева

Стар. 12–13

**ДЗЕСЯЦЬ ГОД НАПЕРАД(ЗЕ)**

Галоўны сэнс існавання «Студэнцкай думкі» — чытачы

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ
Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

## Паміж партыяй і рухам

З Юрасём Губарэвічам размаўляе Вольга Хвоін

▸ **ГЕАПАЛІТЫКА**

# ДЫПЛАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

Вольга ХВОІН

**У добра пастаўленым спектаклі і акцёры, і гледачы выконваюць свае ролі. І рэжысёру яны вядомыя загадзя.**



Палітычны скандал паміж Масквой і Мінскам пасля пасяджэння саюзнага саўміну — не збег абставінаў і палкіх заяў, а прадуманая дзея. Пакуль кіраўнікі Беларусі Аляксандр Лукашэнка абменьваўся з расійскім прэм'ерам Уладзімірам Пуціным ветлівасцямі і расказвалі пра гатоўнасць «падставіць плячо», намеснік Пуціна Аляксей Кудрын расставіў акцэнты ў сапраўдных узаемаадносінах дзвюх дзяржаў.

З вуснаў расійскага палітыка прагучала тое, што беларускія ўлады старанна хаваюць ад шырокай публікі. У прыватнасці, Кудрын паведаміў, што Беларусь мае праблемы з золатавалютнымі рэзервамі, а напрыканцы года яе чакае фінансавая яма. «У першым квартале Беларусь выдаткавала больш за два мільярды долараў золатавалютных рэзерваў для падтрымання курсу. Гэта больш адной трацiны ўсіх золатавалютных рэзерваў краіны. Яшчэ праз квартал Беларусь выдаткуе столькі ж, і да канца трэцяга квартала валюты не застанецца», — заявіў Кудрын.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што выказванні Кудрына мелі на мэце «пасеяць паніку ў Беларусі» ў той час, калі адбываліся міждзяржаўныя сустрэчы «абсалютна на сяброўскай ноце». Таксама кіраўнік Беларусі сказаў, што расійскі віцэ-прэм'ер «цалкам кансалідаваўся з нашымі адмарозкамі, якія тут на заходнія грошы вякаюць і пачынаюць нас вучыць працаваць». Каталізатар спрацаваў: дыпламатычны скандал, папсаваныя ўзаемаадносіны і нейкая гарантыя, што бліжэйшым часам Беларусь не будзе прасіць грошы, якія ёй надзвычай неабходныя.

Няўдалыя па факту, а не дэкларатыўнасці перамовы з Уладзімірам Пуціным пра вылучэнне Беларусі чарговага крэдыту справакавалі пасля ад'езду расійскай дэлегацыі чарговы разнос чыноўнікам. Аляксандр Лукашэнка не ўтрымаўся, каб не пашантажаваць Расію сяброўствам, але рыторыка прамовы схілілася ў бок безапеляцыйнасці. Звяртаючыся да прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, кіраўнік Беларусі заявіў, што «час кланяцца Расіі скончыўся». «Не выходзіць у Расіі — не трэба біць паклоны, ныць, плакаць, трэба шукаць сваё шчасце ў другой частцы планеты. Я гэта свядома публічна кажу... Хопіць, Сяргей Сяргеевіч, вадзіць за сабою міністраў па пракладзеных сцежках! Трэба ісці ў іншыя месцы, дзе нас не ведаюць, дзе нас чакаюць, і гандляваць — дзесяццю трактарамі, адным камбайнам, па гарбатнай лыжцы цукар вазіць», — падкрэсліў Лукашэнка.

Пасля эканамічных парадаў прагучалі і палітычныя. «Мы незалежная суверэнная краіна, і ўсё будзем рабіць у нашых інтарэсах, — заявіў кіраўнік Беларусі. — Таму запомніце: ніякіх вымольванняў і выпрошванняў. Калі няма ў іх 500 мільёнаў долараў, якія яны нам даўно паабяцалі, і мы спланавалі свой бюджэт адпаведна, то не хадзіце і не прасіце».

Беларускі лідэр выразна акрэсліў важнасць палітычнага моманту: «Гульня задуманая па-буйному, майце на ўвазе. Выстаім — будзе дзяржава. Не выстаім — скамечаць і ў кішэню пакладуць, будзем бегаць потым і глядзець налева і направа, каб нам кавалак хлеба са стала кінулі. За намі 10 мільёнаў таленавітых і працавітых людзей, якіх мы не павінны падставіць і падмануць».

Ужо пасля скандальнага інтэрв'ю Аляксея Кудрына наконт закрэдытаванасці і плацежнай нядзольнасці Беларусі міністр фінансаў Андрэй Харкавец паведаміў СМІ, што знешняя пазыка дзяржавы ў доўгатэрміновым перыядзе сфарміравалася на 11 гадоў пад 4,5 працэнта гадавых. Паводле слоў міністра фінансаў, Расія маніпулюе паняццямі на перамовах пра вылучэнне Беларусі крэдытаў. «Тут ідзе змешванне паняццяў. Мы запытвалі два крэдыты: 500 мільёнаў долараў на папаўненне золатавалютных рэзерваў і паралельна вяліся перамовы па прыцягненні крэдыту ў аб'ёме 100 мільярдаў расійскіх рублёў для фінансавання ўзаемнага гандлю, абслугоўвання ўзаемных разлікаў у расійскіх рублях», — адзначыў Харкавец.

«Расія прапанавала 500 мільёнаў у расійскіх рублях. Расійскі рубель канвертуецца, то яны нам заявілі, што мы можам узяць гэты крэдыт і ў расійскіх рублях, і ў доларах. Гэта не адмова ад крэдыту ў расійскіх рублях. Мы гаворым пра два прынцыпова розныя крэдыты», — дадаў Андрэй Харковец. Імкненне чыноўніка абяліць эканамічную сітуацыю ў Беларусі запозненыя. Перапалку Кудрына і Лукашэнкі растыражавалі многія СМІ. Ва ўмовах, калі інфармацыя замоўчваецца, заявы расійскага віцэ-прэм'ера для грамадзян сталі своеасаблівым адкрыццём, якое пераламіць, відаць, не атрымаецца хаця б таму, што справы ў рэальным сектары эканомікі пацвярджаюць словы палітыка.

Што да міждзяржаўных адносінаў дзвюх суседак, то Расія мэтанакіравана адмаўляецца фінансаваць беларускі рэжым, разумеючы нізкую эфектыўнасць гэтых дзеянняў як з палітычнага, так і эканамічнага бакоў. Лукашэнка паступова страчвае рычагі свайго ўплыву на Маскву, яго казырная карта ў выглядзе газатранспартнай сістэмы ўжо напалову належыць Расіі. На падыходзе будаўніцтва нафтаправоду ў абыход Беларусі БТС–2. Натуральна, ніхто не забараняе шукаць беларускаму рэжыму новых донараў і спонсараў, але пра аргумент «дружбы народаў» давядзецца забыцца. Да таго ж, імідж Лукашэнкі не надта спрыяе наладжванню дзелавых адносінаў, і калі справы будуць ісці ў падобным кірунку, хто ведае, магчыма, Беларусь прыйдзе да вымушанай змены палітычных элітаў.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### КОБРЫН. КАЎБАСА СА СТРАУСАЎ

Тэхналогія вытворчасці каўбасы з яек і мяса страусаў распрацоўваецца на кобрынскім мясакамбінаце.

Ідэю перапрацоўнікам падказалі на страусінай ферме, якую збудавала некалькі гадоў таму ў вёсцы Козішча сумеснае беларуска-польскае прадпрыемства. Сёння гэта адна з буйнейшых гаспадарак у Еўропе па вырошчванню гэтай аўстралійскай птушкі на Беларусі.

Напачатку каўбаса будзе вырабляцца невялікімі партыямі, аб'ём якіх вызначыць рынкавы попыт.

### ВЕРХНЯДЗВІНСК. ФЭСТ У ІМЯ БУДУЧЫНІ

На свята мастацтваў *«Дзвіна — Двина — Daugava»* прыехалі творчыя дзіцячыя калектывы з шэрагу раёнаў Віцебшчыны, а таксама з Масквы і Таліна.

Мерапрыемства арганізавана ў 11-ы раз, прысвечана Году роднай зямлі і прайшло пад назвай «Зямлі маёй замілаванне». Галоўная падзея — традыцыйны конкурс дзіцячых тэатраў «Ззянне». Агулам у горад прыехала 160 юных артыстаў.

### СТОЛІН. ДЭБЮТ ЮНЫХ ТАЛЕНТАЎ

У межах праграмы «Маладыя таленты Беларусі» адбыўся літаратурны конкурс юных паэтаў і празаікаў «Дэбют».

26 навучальных установаў раёна прадставілі на разгляд журы 80 творчых прац у трох узроставых групах — да 10, 13 і 18 гадоў. Пераможцы названыя, а лепшы творы надрукуюць у зборніку паэзіі і прозы Століншчыны.

### ВІЛЬНЯ. ЗАХАВАНА ПАМЯЦЬ ПРА КАЛІНОЎСКАГА

Таварыства беларускай культуры ў Літве атрымала прыемную вестку: крыж, што ўсталяваны на месцы пакарання смерцю Кастуся Каліноўскага, які не быў улічаны пры стварэнні праектаў па рэканструкцыі Лукішскага пляца, будзе захаваны.

Літоўскі ўрад адрэагаваў на заявы таварыства і накіраваў адпаведнае рашэнне ў Міністэрства культуры.

Міністэрства культуры, рэагуючы на пастанову Літоўскага ўрада, разам з Дэпартаментам развіцця горада Віленскай гарадской самаўправы разгледзелі заяву Таварыства беларускай культуры ў Літве і вырашылі, што пры рэканструкцыі Лукішскага пляца будзе звернута ўвага на захаванне месца пашаны Кастуся Каліноўскага. Міністэрства культуры лічыць, што ўсталяваны крыж памяці Кастуся Каліноўскага на Лукішскім пляцы мусіць быць захаваны.

▸ НАРЭШЦЕ

# БЕЛАРУСКІ ЕЎРАПЕЙСКІ ФОРУМ

**На гэтым тыдні пачаў працу аргкамітэт Беларускага еўрапейскага форума.**

У першым пасяджэнні ўдзельнічалі прадстаўнікі арганізацый Рух «За Свабоду», «Малады фронт», ПСП, БХД, «Правы альянс», «Маладая Беларусь», МХСС «Маладыя дэмакраты» і лідэры шэрагу рэгіянальных арганізацый.

Беларускі еўрапейскі форум вырашана правесці ў сярэдзіне лістапада. На пасаду старшыні аргкамітэта аднагалосна абраны Аляксандр Мілінкевіч, які правёў першае пасяджэнне.

Склад аргкамітэта застаецца адкрытым. Да працы па арганізацыі форума могуць далучацца іншыя парадстаўнікі грамадскіх і палітычных структураў. З гэтай нагоды лідэр Руху «За Свабоду» плануе распаўсюдзіць адпаведны зварот.

З мэтай арганізацыі правядзення рэгіянальных сходаў, на якіх будуць вылучацца дэлегаты, прынята рашэнне пра стварэнне абласных аргкамітэтаў, а таксама складзены папярэдні графік правядзення абласных нарадаў.

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду»**

▸ ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ЧАРГОВЫЯ «РАЗБОРКІ» Ў «НОВАЙ ДРУЦІ»

**ААТ «Новая Друць» — адна з буйнейшых і багацейшых гаспадарак Бялыніцкага раёна. Дзякуючы таму, што асноўным акцыянерам гаспадаркі з'яўляецца Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, гаспадарка не мае ніякіх праблем з забеспячэннем фінансавымі рэсурсамі, сярэдні заробак працаўнікоў таварыства нашмат перавышае заробак у іншых сельскагаспадарчых прадпрыемствах раёна.**

У апошнія месяцы гаспадарку пачалі трэсці праверкі з розных інстанцый. Так, толькі ў красавіку і маі таварыства правяралі спецыялісты з КРУ і Камітэта дзяржаўнага кантролю. Па словах супрацоўнікаў адміністрацыі гаспадаркі, быў выяўлены шэраг парушэнняў у фінансава-гаспадарчай дзейнасці, якія адносяцца да часу, калі кіраўніком ААТ «Новая Друць» быў Ігар Бондараў.

Нагадаем, што ў кастрычніку 2008 года Ігар Бондараў звольніўся з пасады дырэктара ААТ «Новая Друць» па ўласным жаданні. За добрую працу кіраўніцтва холдынга «Мачулішчы», куды ўваходзіць ААТ «Новая Друць», узнагародзіла яго грашовай прэміяй і каштоўным падарункам.

Пераемнікам Ігара Бондарава на пасадзе кіраўніка гаспадаркі стаў былы старшыня Клімавіцкага райвыканкама Уладзімір Канавалаў. Па словах спецыялістаў гаспадаркі, новы кіраўнік адразу ж выявіў шэраг недахопаў. Невядома куды падзелася значная колькасць збожжа, вялікая колькасць зерня была прададзена камерцыйнай структуры, але грошы за яго на разліковы рахунак ААТ «Новая Друць» так і не прыйшлі. За гэты «цікавы» выпадак былы кіраўнік гаспадаркі Ігар Бондараў абавязаны выплаціць ААТ «Новая Друць» 15 мільёнаў рублёў. Дарэчы, незалежная раённая газета «Паходня» неадназова пісала пра тое, як добрае зерне з ААТ «Новая Друць» вывозілася на звалкі і ў лес на падкормку дзікам. Але якая справа нашым уладам да матэрыялаў апазіцыйнай газеты...

Як кажуць супрацоўнікі таварыства, новы дырэктар быў вельмі здзіўлены, колькі сродкаў пайшло на розныя нязначныя будаўнічыя аб'екты. Пра гэта ён неадназова заяўляў сваім падначаленым, а ў хуткім часе гаспадарку пачалі трэсці разнастайныя праверкі.

Сапраўды, вельмі дзіўна, чаму пры такой вялікай колькасці нарыхтаваных (на паперы) кармоў, ужо з сярэдзіны зімы сянаж на корм жывёлам у ААТ «Новая Друць» завозілі з Віцебскай і Брэсцкай абласцей.

У красавіку Уладзімір Канавалаў трапіў у абласную бальніцу пасля таго, як у пад'ездзе дома на яго напалі і моцна пабілі невядомыя хуліганы. Супрацоўнікі міліцыі ўхіляюцца ад адказу на пытанне пра падазраваных, працаўнікі таварыства лічаць, што дырэктар трапіў у бальніцу з-за таго, што шмат хацеў ведаць пра дзейнасць мінулага кіраўніцтва.

Праверкі дзейнасці ААТ «Новая Друць» тым часам працягваюцца, што выклікае вялікае напружанне ў спецыялістаў гаспадаркі. Так, у сярэдзіне мая з памяшкання канторы таварыства «хуткая дапамога» забрала ў бальніцу адну з супрацоўніц бухгалтэрыі. Па словах супрацоўнікаў КДК, вельмі шмат пытанняў у іх узнікае да дзейнасці былога галоўнага бухгалтара ААТ «Новая Друць», былога кіраўніка Ігара Бондарава і шэрагу іншых спецыялістаў.

**Сяргей Семяновіч, Бялынічы**

▸ СПРАВА

# ФРАНАК ВЯЧОРКА ЗНОЎ У ШПІТАЛІ

**Лідэра моладзевай арганізацыі Партыі БНФ «Моладзь БНФ» Франака Вячорку змясцілі ў ваенны медыцынскі цэнтр № 290 у Бабруйску. Пра гэта паведаміў яго бацька, першы намеснік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка.**

Паводле слоў Вінцука Вячоркі, накіраванне Франака ў ваенны медыцынскі цэнтр звязана з тым, што ў яго ўзніклі праблемы з сэрцам і касцявой сустаўнай сістэмай. «З прычыны гэтага летась Франака прызналі непрыгодным да праходжання ваеннай службы», — нагадаў бацька.

Цяпер Франак Вячорка будзе праходзіць комплекснае абследаванне. «Наколькі я ведаю, гэта абследаванне было прызначана па рэкамендацыі медыцынскага цэнтра ваеннай часці, у якой праходзіць службу мой сын. Час абследавання не вызначаны», — сказаў Вінцук Вячорка.

Ён таксама паведаміў, што 2 чэрвеня ў ваенную часць, дзе праходзіць службу сын, прыязджала здымачная група беларускага тэлебачання. «Я не выключаю варыянт таго, што беларускае тэлебачанне рыхтуе чарговы «шэдэўр» у стылі фільма «Малады фронт. Кіднепінг», — сказаў Вінцук Вячорка.

Нагадаем, у ліпені 2008 года медкамісія ваенкамата Савецкага раёна Мінска прызнала Франака Вячорку непрыгодным да ваеннай службы па стане здароўя. Абласная медкамісія паставіла гэта рашэнне пад сумненне. Пасля абследавання ў ваенным шпіталі маладому чалавеку была дадзена адтэрміноўка ад службы да сакавіка 2009 года. Аднак 16 студзеня ваенкамат Савецкага раёна Мінска прызнаў маладзенага актывіста прыгодным да ваеннай службы. Суд гэтага ж раёна, дзе было абскарджана рашэнне ваенкамата, 23 студзеня пакінуў яго ў сіле. Рашэнне суда было прынята ў адсутнасць Франака і яго адваката.

**БелаПАН**

▸ ПРАДПРЫМАЛЬНАСЦЬ

# МЕДАВУХА НА МЯСАКАМБІНАЦЕ

**ААТ «Гродзенскі мясакамбінат» першым у Беларусі атрымала ліцэнзію на вытворчасць медавухі для рэстарана ва ўласным турыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак».**

Як паведаміў журналістам генеральны дырэктар прадпрыемства Анатоль Грышук, у месяц плануецца выпускаць дзве-тры тоны прадукцыі. Яна атрымліваецца метадам халоднага зброджвання мёду, вады і іншых інгрэдыентаў. У меню рэстарана таксама ёсць стравы з дзікіх жывёл, здабытых на паляванні.

Будаўніцтва аграрна-турыстычнага комплексу было распачата ў 2004 годзе. Цэнтр стылізаваны пад панскі маёнтак XVII стагоддзя з коннаспартыўным клубам, з вялікімі і малымі сажалкамі, вальерамі для свойскіх і дзікіх жывёл.

Паводле слоў А. Грышука, месца прызначана для сямейнага адпачынку. Па выходных цэнтр наведваюць 2000 турыстаў з Беларусі і замежжа, штодзённая выручка складае каля 20 мільёнаў рублёў.

**БелаПАН**

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. НАВІНЫ ТЫДНЯ

### НАВАПОЛАЦК. ЛЕГЕНДА БАРДАЎСКАЙ ПЕСНІ

Суполка «Рубон» Наваполацкай гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, сумесна з Моладдзю БНФ арганізавала ў Наваполацку творчую сустрэчу з вядомым бардам Сяржуком Сокалавым-Воюшам. Сярод тых, хто сабраўся на сустрэчу, было шмат як былых паплечнікаў Сяржука па барацьбе за адраджэнне Беларусі канца 1980-х гадоў, так і моладзі, выхаванай на яго спевах. Пасля цёплай гутаркі і мноства выканаых хітоў, С. Сокалаў-Воюш паабяцаў хутка вярнуцца з новым альбомам і вершамі. Магчыма, новы творчы візіт адбудзецца ўжо гэтай зімой.

### БРЭСТ. СУМЕСНА ПРАВЯЛІ СВЯТА

Суб'екты АДС Брэсцкай вобласці супольна з прадстаўнікамі грамадскасці арганізавалі шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных Міжнароднаму Дню абароны правоў дзіцяці. Найперш быў праведзены традыцыйны гарадскі турнір па міні-футболу сярод дзяцей і дарослых пад дэвізам «Спорт супраць гвалту». У гэты дзень прайшоў і «круглы стол», арганізаваны Беларускім Хельсінскім камітэтам, на якім былі абмеркаваны праблемы правоў дзіцяці на Беларусі. Падобныя «круглыя сталы» адбыліся ў Баранавічах, Пружанах, Белаазёрску і пасёлку Рэвяцічы Бярозаўскага раёна.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НОВАЯ «ХАЛОДНАЯ ВАЙНА»

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Штосьці нядобрае робіцца ў нашым «Дацкім каралеўстве». Ніхто не чакаў таго, што паміж Беларуссю і Расіяй пачнецца «халодная вайна». І не ў перыяд падпісання газавых дамоваў, у снежні-студзені, а так, пасярод лета. Здаецца, лета ж было заўсёды тэрмінам адпачынку. Але ж — не зараз.**

28 мая ў Мінску, дзе праходзіла пасяджэнне Савета міністраў Саюзнай дзяржавы, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын паставіў пад сумненне плацежаздольнасць Беларусі, крытычна ацаніў золатавалютныя рэзервы краіны, а таксама паведаміў пра адмову беларускага боку ад чарговага траншу крэдыту ў рублях.

У адказ на гэта Аляксандр Лукашэнка 29 мая запатрабаваў ад урада Беларусі не кланяцца перад Расіяй. Гэта рыторыка не магла застацца без увагі з боку расійскага кіраўніцтва. З чэрвеня прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў назваў недапушчальнымі з пункта гледжання дыпламатычнай этыкі выказванні на адрас прадстаўнікоў расійскай дзяржавы, якія дазволіў сабе кіраўнік адной з краін — найбліжэйшых партнёраў Расіі.

«Мы актыўна па-партнёрску працуем з нашымі найбліжэйшымі суседзямі, дапамагаем ім у пераадоленні крызісных з'яў, у тым ліку фінансамі, і немаленькімі фінансамі. Часам гэта суправаджаецца неабходнасцю каментаваць эканамічную сітуацыю ў гэтых краінах», — сказаў Мядзведзеў 3 чэрвеня на нарадзе па эканамічных пытаннях.

Ён падкрэсліў, што ў Расіі «ніколі не дазвалялі і не будуць дазваляць сабе асабістых характарыстык у дачыненні да кіраўнікоў іншых краін». «Хаця мы маглі б сказаць штосьці адносна эфектыўнасці эканамічных мер, якія яны прымаюць», — дадаў Мядзведзеў.

«Лічу, што з пункта гледжання дыпламатычнай этыкі гэта непрымальна, і разлічваю, што такую ж пазіцыю зоймуць і нашы найбліжэйшыя партнёры», — падкрэсліў расійскі прэзідэнт.

Калі выказацца недыпламатычнай мовай, Аляксандра Лукашэнку паставілі на месца. Мы вам даем грошы, газ і нафту, таму паводзьце сябе прыстойна і не кусайце руку давальшчыка. Гэта пасланне Мядзведзева да Аляксандра Рыгоравіча. Больш за тое, варта звярнуць увагу на іншы пасаж прэзідэнта Расіі. А канкрэтна: «Мы маглі б сказаць штосьці адносна эфектыўнасці эканамічных мер, якія яны прымаюць». Здаецца мне, гэтым выказваннем Мядзведзеў паставіў пад сумнеў якасць эканамічных рэформаў у Беларусі і адзначыў нежыццяздольнасць «беларускага цуда» і «беларускай эканамічнай мадэлі».

Дарэчы, пра гэта шмат эканамістаў і аналітыкаў неаднаразова казалі беларускаму прэзідэнту. Колькі заяваў да яго напісаў хаця б адзін лідэр прадпрымальніцкага аб'яднання «Перспектыва» Анатоль Шумчанка! Усе ягоныя заявы зводзіліся да аднаго: «Хопіць кашмарыць бізнес!» Малы бізнес дае працоўныя месцы, падаткі ў бюджэт, камфорт людзям... Але тым часам для прыватнай ініцыятывы хутка ў Беларусі месца не застанецца.

Але нешта наша кіраўніцтва не хоча бачыць таго, што адбываецца ў Расіі. Нягледзячы на выказванні прэзідэнта Расіі, 2 чэрвеня ва ўрад Расіі накіраваны афіцыйны запыт аб прадастаўленні Беларусі крэдыту ў памеры 9 мільярдаў долараў ЗША на будаўніцтва АЭС і яе транспартнай і прамысловай інфраструктуры. Як лічыць дырэктар дэпартамента па ядзернай энергетыцы Міністэрства энергетыкі Мікалай Груша, «па пытанні фінансавання АЭС праблем быць не павінна». «Што тычыцца інфраструктуры, то мы знайшлі разуменне з «Расатамам». Аднак гэтая карпарацыя — не ўрад», — падкрэсліў ён.

Калі «Расатам» — не ўрад, дык навошта было накіроўваць заяву на крэдыт менавіта да ўраду РФ? Здаецца, тут зноў пачынаюцца нейкія «паддавановыя гульні», якія абавязкова вылезуць бокам не толькі беларускаму ўраду, але і беларускаму народу.

А тым часам нас працягваюць суцяшаць і заспакойваць. Міністр фінансаў Беларусі Андрэй Харкавец пазітыўна ацэньвае паказчыкі знешняга дзярждоўгу Беларусі ў доўгатэрміновай перспектыве. «Калі казаць у доўгатэрміновым перыядзе пра дзяржаўны доўг (а ён у прынцыпе заўсёды разглядаецца як катэгорыя ў доўгатэрміновым перыядзе), скажу, што ў сярэднім наш доўг сёння — 11 гадоў да пагашэння. Гэта вельмі добры паказчык. Кошт — каля 4 працэнтаў гадавых. Гэта мізэрныя велічыні для абслугоўвання доўгу», — заявіў міністр.

Здаецца, я дрэнна вучыўся ў школе. 4 працэнта гадавых на 11 год, — гэта 44 працэнта. На сёння, па той жа інфармацыі Харкаўца, знешні доўг Беларусі — 5 мільярдаў долараў. Гэта значыць, што праз 10 год мы аддадзім не 5 мільярдаў, а прыкладна 7,5 мільярда.

Паводле слоў міністра, падчас нядаўняга планавага візіту эксперты рэйтынгавага агенцтва *Standard & Poor's* ацанілі магчымасці Беларусі па нарошчванні знешняга доўгу сёлета да 9 мільярдаў долараў ЗША. А вось зараз і можна смяяцца. Мы не толькі патрабуем ад Расіі другога траншу крэдыту ў 500 мільёнаў долараў, але і на атамную станцыю просім роўна 9 мільярдаў долараў. То бок, перавышаем гранічную планку крэдытавання па версіі *Standard & Poor's*.

Здаецца мне, што ў нашым Міністэрстве эканомікі і Міністэрстве фінансаў, а таксама ва ўрадзе і Нацбанку трэба развесціь вялікія лозунгі з вядомым афарызмам: «Бярэш чужыя грошы і часова, а аддаеш свае і назаўсёды».

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ


Photo.ByMedia.Net

### ВАДЗІМ ПАПОЎ

Беларускі парламент, аказваецца, мае голас. І ў голасу ёсць імя. Дэпутат Вадзім Папоў запатрабаваў ад міністра фінансаў Андрэя Харкаўца ўнесці ў Палату прадстаўнікоў законапраект аб карэкціроўцы нацыянальнага бюджэту на 2009 год. «Як вы робіце справаздачу пра выкананне бюджэту за 2009 год? — спытаў Вадзім Папоў на паседжанні камісіі Савета Рэспублікі па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы. — Ніякіх законапраектаў пра карэкціроўку бюджэту ў парламент не ўносілася. Вы займаецеся антызаканадаўчай дзейнасцю», — цытуе «Інтэрфакс» словы смелага і гаваркога парламентарыя. Свае прэтэнзіі Папоў аргументаваў тым, што адначасова існуюць прыняты парламентам яшчэ мінулай восенню закон аб бюджэце на 2009 год і падпісаны ў маі Указ Аляксандра Лукашэнкі аб секвестры гэтага бюджэту.

«Як так атрымалася, што вы 5 месяцаў прапрацавалі, і ў вас няма прапановаў, што рабіць з законам, які абавязковы для выканання? — абураўся Папоў. — Закон ёсць закон, і яго трэба выконваць. Як жа будзе выконвацца кожны артыкул нашага асноўнага закона?» Пры гэтым Папоў канстатаваў значныя праблемы з фінансаваннем бюджэтных выдаткаў у рэгіёнах, што прыводзіць да росту запазычанасці бюджэту перад падрадчыкамі. «Правалочка з фінансаваннем маецца фактычна. Калі так пойдзе і надалей, дык праграма выканання будзе сарваная», — лічыць Папоў. Міністр Фінансаў Андрэй Харкавец парламентарыям пра планы ўрада адносна ўнясення законапраекта па карэкціроўцы нацыянальнага бюджэту на 2009 год не паведаміў.

За часы кіравання Лукашэнкі дэпутацкая дзейнасць сышла на мінімум. Хто ў дэпутатах і чым яны ўвогуле там займаюцца, люду паспалітаму не вядома. А вось жа аказалася, што і сярод «нябачных парламентарыяў» ёсць жывыя.


Фота Юрыя Дзядзінкіна

### СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

Беларускі паэт Славамір Адамовіч, які ў 2002 з'ехаў у Нарвегію, плануе вярнуцца дадому. Адпаведны запыт ён накіраваў у МЗС Беларусі. У адказ Адамовічу параілі звярнуцца ў пасольства. «Для атрымання дакумента на вяртанне ў Рэспубліку Беларусь — пасведчанне на вяртанне ў Беларусь, Вам неабходна звярнуцца ў замежнае прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь. Бліжэйшае — Пасольства Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Швецыя», — перадае распавед паэта Еўрапейскае радыё для Беларусі. Славамір Адамовіч ужо падаў дакументы ў беларускае пасольства ў Швецыі на атрыманне праязнога дакументу для вяртання ў Беларусь.

Паэт Славамір Адамовіч у сярэдзіне 1990-х правёў восем месяцаў у следчым ізалятары беларускага КДБ за верш «Забі прэзідэнта». А ў 2002 годзе паехаў на заробкі ў Нарвегію, дзе атрымаў гуманітарны прытулак. Цяпер жыве на поўначы Нарвегіі ў гарадку Буда.

### МІКАЛАЙ АЎТУХОВІЧ

Прадпрымальнік Мікола Аўтуховіч другі месяц трымае галадоўку ў мінскім следчым ізалятары на вуліцы Валадарскага. Гэтым ён дамагаецца хутчэйшага разгляду справы ці хаця б змянення меры стрымання. Але пакуль што намаганні Аўтуховіча марныя — расследаванне справы Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенкі працягнуце да 3 ліпеня.

Адвакат Аўтуховіча Павел Сапелка бачыўся з Мікалаем Аўтуховічам у следчым ізалятары. «Ён сказаў, што меру стрымання не змянілі, і таму ён працягвае галадоўку пратэсту. Аўтуховіч выглядае вельмі стомленым, ён згубіў больш за 25 кілаграмаў вагі і кожны тыдзень працягвае страчваць па 2–3 кілаграмы. Кропельніцу цяпер яму не ставяць, але працягваюць трымаць у медыцынскай частцы ізалятару», — расказвае адвакат пра стан здароўя і ўтрыманне прадпрымальніка. Павел Сапелка збіраецца абскарджваць рашэнне, паводле якога ягонаму падабароннаму не змянілі меру стрымання.


Фота Юрыя Дзядзінкіна

## ПАМЯЦІ КАЛЕГІ

# СТРАТА ДЛЯ ЎСЁЙ БЕЛАРУСІ

**Увечары 1 чэрвеня не стала Аляксандра Патупы. Ён ніколі не скардзіўся на хваробы, і таму смерць яго была раптоўнай і нечаканай.**



Ён быў неўгамонны чалавек, са складаным характарам, з прынцыповым поглядам на ўсё, што адбываецца ў краіне.

«Гэта вялікая страта не толькі для сваякоў, для прадпрымальнікаў, але і для ўсёй Беларусі», — пад гэтымі словамі старшыні Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзіміра Карагіна можа падпісацца кожны, хто хоць аднойчы сустракаўся з Аляксандрам Патупам.

Аўтар навуковых, навукова-папулярных і навукова-мастацкіх твораў, мноства артыкулаў, апублікаваных у перыядычным друку, сябар Міжнароднага ПЭН-клуба і Беларускай асацыяцыі журналістаў. Доктар філасофіі, прафесар, сапраўдны член Міжнароднай акадэміі інфармацыйных працэсаў і тэхналогій, Міжнароднай акадэміі лідэраў бізнесу і адміністрацыі, Нью-Йоркскай акадэміі навук, Міжнароднага інстытута сацыялогіі, Амерыканскай асацыяцыі садзейнічання развіццю навукі, Нацыянальнага геаграфічнага таварыства ЗША.

Аляксандру Сяргеевічу было толькі 64 гады. У яго было яшчэ столькі планаў і праектаў, яшчэ так шмат ён збіраўся зрабіць для краіны…

Рэдакцыя газеты «Новы час» выказвае шчырае спачуванне ўсім родным і сваякам Аляксандра Сяргеевіча Патупы і смуткуе разам з усёй Беларуссю.

▸ ПАРЛАМЕНТ

# ДЭПУТАТАЎ ХВАЛЮЮЦЬ КЛЯШЧЫ І ПАМІДОРЫ

Вольга ХВОІН

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Іван Бамбіза на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі адзначыў запавольванне тэмпаў інфляцыі ў студзені–красавіку гэтага года.**


Photo.ByMedia.Net

Падставай для гэта віцэ-прэм'ер лічыць некаторыя станоўчыя тэндэнцыі ў сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. У прыватнасці, станоўчую дынаміку росту ВУП. У першым квартале ён склаў 101,2 працэнта да ўзроўню адпаведнага перыяду 2008 года. «Гэта абумоўлена некаторым ажыўленнем фінансава-гаспадарчай дзейнасці і неістотным, але ростам вытворчасці ў параўнанні са студзенем–сакавіком 2009 года на прадпрыемствах міністэрстваў прамысловасці, архітэктуры і будаўніцтва, канцэрнаў «Белнафтахім» і «Белбіяфарм», — патлумачыў Бамбіза.

Аднак прагнозныя паказчыкі на 2009 год па тэмпах росту прамысловай прадукцыі не выконваюцца. Суадносіны запасаў гатовай прадукцыі і сярэднемесячнага аб'ёму вытворчасці на прамысловых прадпрыемствах у студзені-красавіку ў фактычных коштах склалі 93,2 працэнта супраць 51 у такім жа перыядзе 2008 года. Запасы гатовай прадукцыі ў студзені-красавіку ўзраслі ў параўнанні з іх узроўнем на пачатак года практычна ва ўсіх міністэрствах і ведамствах. І хаця лічбы гавораць пра некаторую актывізацыю збыту (у сакавіку складскія запасы ўзраслі на 450 мільярдаў рублёў, у красавіку — на 191 мільярд рублёў), варта памятаць, што аб'ёмы вытворчасці істотна ўпалі. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі ў першым квартале 2009 года склала 9,8 працэнта супраць 14,9 працэнта ў першым квартале мінулага года.

У сваім выступе перад парламентарыямі віцэ-прэм'ер Іван Бамбіза адзначыў, што ў краіне запавольваюцца тэмпы росту спажывецкіх коштаў. У студзені гэты паказчык складаў 104 працэнты, у лютым — 101,2, у сакавіку — 100,6, у красавіку — 100,4 працэнта. Зводны індэкс спажывецкіх коштаў, які характарызуе інфляцыю, у студзені–красавіку склаў 106,5 працэнта, у тым ліку на харчовыя тавары — 105,7, на нехарчовыя — 106,3 працэнта. Пытанне росту курсаў валюты, да якой прывязаныя кошты на многія тавары, віцэ-прэм'ер абмінуў.

З вуснаў Бамбізы прагучала і папулісцкая заява пра павелічэнне тарыфнай стаўкі першага разраду. Віцэ-прэм'ер паведаміў, што распрацаваны праект пастановы, які прадугледжвае павелічэнне з 1 чэрвеня тарыфнай стаўкі з 77 да 83 тысяч рублёў. Аднак па стане на 2 чэрвеня міністэрствы інфармацыю пра тое, што павялічваюць стаўку першага разраду і, адпаведна, заробкі, не агучвалі. Тарыфная стаўка першага разраду падвышалася 1 лістапада 2008 года з 73 да 91 тысячы рублёў, аднак 1 снежня ўрад знізіў яе да 77 тысяч. Спыніць рост заробкаў — адна з умоў Міжнароднага валютнага фонду для выдзялення крэдыту. Цяпер ідуць перамовы пра пераход Беларусі другога траншу.

Парламентарыяў сацыяльны аспект развіцця краіны хвалюе больш за эканамічны. Прынамсі такія высновы можна зрабіць з дадатковых пытанняў да прадстаўнікоў ураду. Дэпутатаў цікавіць устаноўка ляжачых паліцэйскіх, барацьба з кляшчамі, дазвол на выкарыстанне ў рыбнай лоўлі сетак, якасць і кошты на сельскагаспадарчую прадукцыю айчыннай вытворчасці і іншае.

Да прыкладу, цяпер ужо міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў паведаміў, што некаторыя вернікі, магчыма, змогуць атрымаць пашпарты без асабістых нумароў. «Маё меркаванне такое, магчыма, мы зможам не праставляць асабістыя нумары ў пашпарты гэтых грамадзян. Такіх асобаў нямнога, чалавек пяцьсот», — сказаў Анатоль Куляшоў, адзначыўшы, што гэта пытанне патрабуе дадатковага абмеркавання. У парламент з адпаведным запытам звярталіся вернікі, якія адмаўляюцца атрымліваць пашпарты новага ўзору з прычыны таго, што ім будуць прысвоеныя асабістыя нумары, а гэта супярэчыць рэлігійным перакананням.

На пытанне пра суадносіны якасці і кошту айчыннай сельскагаспадарчай прадукцыі віцэ-прэм'ер Іван Бамбіза зазначыў: «Сваё заўсёды больш выгоднае, нават калі яно стратнае. Нават калі для прадпрыемства прадукцыя нерэнтабельная, для дзяржавы яна выгодная». Тут, натуральна, віцэ-прэм'ер зрабіў акцэнт на эканоміі валютных сродкаў. Цэны на цяплічную прадукцыю цяпер не рэгулююцца дзяржавай, і прадпрыемствы ўстанаўліваюць іх згодна рыначнай кан'юнктуры. «Калі б нашая прадукцыя была даражэй, яе не набывалі б», — падкрэсліў Бамбіза.

Першы намеснік міністра па падатках і зборах Уладзімір Палуян на пытанне, якім чынам плануецца абмяжоўваць паленне тытуню, адзначыў, што цяперашнія механізмы падвышэння коштаў недзеяздольныя. «Толькі за чатыры месяцы гэтага года рознічныя цэны на тытунёвыя вырабы падвышаліся тройчы. Стаўкі акцызаў з першага студзеня 2009 года, у параўнанні з 2008 годам, павысіліся на восем працэнтаў. Калі рабіць недаступным кошт, ідзе шэры імпарт з Расіі. Цяпер канфіскавана звыш 15 мільёнаў цыгарэт. Таму бязмэжна павялічваць кошты на тытунёвыя вырабы неэфектыўна», — лічыць прадстаўнік міністэрства па падатках і зборах. Уладзімір Палуян таксама паведаміў, што падвысіць з першага чэрвеня падатак на дабаўленую вартасць з 18 да 22 працэнтаў складана з-за кароткага тэрміну падрыхтоўкі працэдуры. «Заднім числом уводзіць новы ПДВ немагчыма», — падкрэсліў Палуян.

Дадатковых пытанняў да прадстаўнікоў мінфіна і мінэканомікі ў парламентарыяў падчас сумеснага паседжання не з'явілася.

▸ АПАЗІЦЫЯ

# КАСА НА КАМЕНЬ

Марыя КРУК

**Смеласць супраць досведу. Маладыя супраць аксакалаў. У апазіцыйных колах пакрысе набіраецца хваля «новых палітыкаў» пад патранажам Аляксандра Мілінкевіча.**

Цяпер найбольш выразныя абрысы мае канфлікт паміж партыяй БНФ і Рухам «За свабоду». Апошняму закідваюцца абвінавачванні ў пераманьванні кадраў (у асноўным маладых) і лаяльнасці да рэжыму. На днях 11 актывістаў БНФ, у тым ліку Уладзімір Арлоў, Пётр Садоўскі, Валянцін Голубеў, Аляксей Марачкін, Юры Хадыка, распаўсюдзілі сярод аднапартыйцаў ліст, у якім заклікаюць «падтрымаць маральную нацыянальна-дэмакратычную пазіцыю» і «не паддавацца на лiслівыя намовы ідэолагаў «кіраванай апазіцыі»».

У лісце недвухсэнсоўна гаворыцца, што «некаторыя дзеячы палітычнай сцэны Беларусі ўжо фактычна пайшлі па слізкай дарожцы прыслугоўвання ўладзе. Яны пачалі пераконваць міжнародную супольнасць і беларускі народ, нібыта цяперашні рэжым стаў на шлях «лібералізацыі». У сувязі з гэтым актыў БНФ заклікае «не пагаджацца аддаваць Беларускі народны фронт палітычным кан'юнктурнікам, рукамі якіх бліжэйшая прэзідэнцкая кампанія будзе выкарыстаная для легітымізацыі рэжыму А. Лукашэнкі. Партыя БНФ павінна імкнуцца вылучыць свайго кандыдата ў прэзідэнты і дамаўляцца толькі з тымі незалежніцкімі сіламі, якія, як і мы, бачаць перспектыву Беларусі не ў перавыхаванні цяперашняга рэжыму, а ў яго сыходзе».

Кіраўніцтва Руху «За свабоду» на чарговы выпад у свой бок адрэагавала досыць спакойна, традыцыйна зазначыўшы: «Мы ўвесь час падкрэсліваем, што захоўваем прынцыповасць па такіх пытаннях, як правы чалавека, палітычныя свабоды». Пры гэтым «засвабодаўцы» трымаюцца пазіцыі «нам надакучыла чакаць і плакаць, маем намер дзейнічаць». У прыватнасці, Аляксандр Мілінкевіч не змяніў рашэння правесці свой еўрапейскі форум як мабілізуючае мерапрыемства для прыхільнікаў еўраінтэграцыі. У першым аргкамітэце форума ўдзельнічалі прадстаўнікі арганізацый Рух «За Свабоду», «Малады фронт», БХД, «Права альянс», «Маладая Беларусь», МХСС «Маладыя дэмакраты», актывісты рэгіянальных арганізацый. Беларускі еўрапейскі форум вырашана правесці ў сярэдзіне лістапада. На пасаду старшыні аргкамітэта аднагалосна абраны Аляксандр Мілінкевіч. Склад аргкамітэта застаецца адкрытым. Да працы па арганізацыі форума могуць далучацца іншыя прадстаўнікі грамадскіх і палітычных структураў. Дарэчы, аргкамітэт форума прынцыпова вырашыў не абіраць прэтэндэнта на пасаду прэзідэнта на самім мерапрыемстве.

Пад эгідай Руху «За свабоду» актывісты з іншых палітычных і грамадскіх структур дзейнічаюць даўно. Уласна кажучы, Мілінкевіч менавіта гэтага і хацеў — шырокі грамадскі рух, незалежна ад партыйнай прыналежнасці. Але падобная актыўнасць негатыўна ўспрымаецца кіраўніцтвам палітычных партый, і чым бліжэй да прэзідэнцкіх выбараў, тым больш нарастае канфрантацыя.

Ліст актыву БНФ ёсць адной з рэакцый на заяву шэрагу лідэраў моладзевых рухаў і арганізацый аб ухвале рашэння Еўрасаюзу улучыць Беларусь у праграму «Усходняга партнёрства» ў цяперашніх умовах і падтрымцы «дзеяннаў лідэра Руху «За Свабоду» Аляксандра Мілінкевіча па наладжванні стасункаў Беларусі з Еўрапейскім саюзам дзеля ўмацавання незалежнасці краіны на ўмовах дэмакратызацыі і павагі да правоў чалавека». Сярод падпісантаў гэтай заявы — Юрась Губарэвіч, Зміцер Дашкевіч, Алесь Лагвінец, Юрась Меляшкевіч, Алесь Міхалевіч, Наста Палажанка, Сяргей Салаш, Павел Севярынец ды іншыя.

Фактычна перад кіраўніцтвам партыйных структур, хутка паўстане выбар: пагадзіцца з тым, што актывісты працуюць на «іншага дзядзьку» ці прымаць штрафныя санкцыі ў дачыненні да іх. Але, улічваючы колькасць і якасць прыхільнікаў Руху «За свабоду», другі варыянт — толькі добрая глеба для далейшага супрацьстаяння і адчужэння людзей. Многія з маладых прыхільнікаў Руху «За свабоду» ўдзельнічалі ў папярэдніх электаральных кампаніях. І, відавочна, свой цяперашні выбар зрабілі з разліку на мацнейшага і найбольш вядомага патэнцыйнага кандыдата на пасаду прэзідэнта.

Дарэчы, партыя БНФ 20 чэрвеня рыхтуе партыйны сход, на якім будзе разглядацца пытанне супрацоўніцтва арганізацыі з Рухам «За свабоду».

АНАЛІЗ

# GAME OVER,
## або Край ніякіх талераў



Photo.ByMedia.Net

Вадзім АЛЕКСАНДРОВІЧ

**Толькі вельмі абыякавыя людзі не абмяркоўваюць дату другога этапу дэвальвацыі беларускага рубля. Бліжэйшая з іх, якую даводзілася чуць аўтару гэтых радкоў, — 8 чэрвеня. Тое, што Міжнародны валютны фонд пакуль не выдаў Беларусі другі транш свайго крэдыту, толькі падштурхоўвае грамадскую думку ў гэтым кірунку, бо ўсе памятаюць, чым быў абумоўлены першы транш напрыканцы мінулага года.**

### Наступная дэвальвацыя не за гарамі?

Цяперашні перадінфарктны стан дзяржсектара беларускай эканомікі было б цалкам недарэчна зводзіць выключна да наступстваў сусветнага крызісу. Больш за тое, з упэўненасцю можна сцвярджаць, што беларускай эканамічнай мадэлі эпохі Лукашэнкі «па-любому» было наканавана сканаць на працягу бліжэйшых гадоў. Скарачэнне імпартнага патэнцыялу Расіі ды Украіны апошняй восенню з-за імклівага падзення попыту і коштаў на сыравіну ды паўфабрыкаты з гэтых краін хіба забіла апошні цвік у дамавіну няхітрай, але даволі жывучай схемы функцыянавання «луканомікі». Можна параўнаць уплыў гэтага чынніка са своеасаблівым праяўнікам аналагавай фотастужкі, які робіць даступным для прагляду тое, што раней існавала ў прытоенай форме. Раней шы «пазітыўны» ўяўны прафіцыт бюджэту праявіўся «негатыўным» страшэнным дэфіцытам.

Можна прыгадаць паведамленне пра поспехі Беларусі ад 29 красавіка 2008 года (звяртаю ўвагу, менавіта 2008-га): «Прафіцыт бюджэту Беларусі ў студзені-сакавіку склаў 1,8 трыльёна беларускіх рублёў (850 мільёнаў долараў), паведамілі БелТА ў Міністэрстве фінансаў. Спецыялісты растлумачылі, што, улічваючы незапатрабаванасць распарадчыкамі сродкаў, прадугледжаных планавых асігнаванняў у поўным аб'ёме, а таксама асобныя выдаткі рэспубліканскага бюджэту, адкладзеныя на другі і трэці кварталы бягучага года, рэальны прафіцыт рэспубліканскага бюджэту без уліку фондаў ацэньваецца ў суме каля 100 мільярдаў рублёў». Чаму ж ужо напрыканцы лета пераможныя эканамічныя рэляцыі дзяржаўных рупараў прапаганды пачалі знікаць, хаця сусветны крызіс наўпрост нас яшчэ не датычыўся?

Нядаўні прафіцыт не складаўся з «рабочых», а наадварот меў паходжанне з «дурных» грошай. Для тых, хто далёкі ад свету эканамічных рэалій, мушу нагадаць — падатковая нагрузка ў нас з прычыны назапашвальнай сістэмы падаткаабкладання перавышае 50 працэнтаў ВУП, у той час як у большасці краін Еўропы гэты паказчык звычайна складае 30–35 працэнтаў. Здаецца, самым разумным крокам будзе зніжэнне падатковай нагрузкі, а не складанне мільярдаў у бюджэце. Маўляў, займацца размеркаваннем прыбыткаў і інвестыцыямі павінны прадпрыемствы і грамадзяне, а не дзяржава... Але сярод асобных эканамічна актыўных персонаў Беларусі існуе думка, што нашы бюджэтныя «дурныя» грошы не вартыя нават гэтага акрэслення, бо папросту былі (і ёсць) «ніякімі» грашыма.

У цяперашняй беларускай сітуацыі лішак грашовай масы, якая паступае ў эканоміку, будзе выдаткаваны на набыццё імпартных тавараў. Што, уласна, і назіралася апошнія чатыры-пяць гадоў адноснага дастатку. Нават бытавыя тавары, што быццам бы зробленыя ў Беларусі, звычайна толькі мясцовая зборка кітайскіх, карэйскіх ці еўрасаюзных камплектуючых. Тыя ж аўтобусы МАЗ уявіць сабе без мерседэсаўскага рухавіка з АКП ужо папросту немагчыма. На інтэгралаўскіх маніторах і гарызонтаўскіх тэлевізарах хутка нават апошняя шрубка будзе мець раскосы выгляд... Таму адмоўнае сальда гандлёвага балансу расло месяц за месяцам яшчэ задоўга да крызісу.

Дзяржаўны апарат спрабаваў з гэтым змагацца, але ўсё было марна. Бо за гады незалежнасці практычна нічога не было зроблена па стварэнню новых вытворчасцяў, якія б маглі працаваць на экспарт, не мадэрнізаваліся сферы паслуг, лагістычны цэнтры. Пачалося гэта яшчэ з часоў Кебіча і Шушкевіча, калі тую ж «*Motorola*» не пусцілі на «Інтэграл» — так што «не ўсё кепскае пачалося ад часу першых прэзідэнцкіх выбараў».

### Імпарту STOP

Цяпер лішнія грошы насельніцтва не могуць быць выдаткаваныя толькі «на імпарт». А куды іх яшчэ траціць? Беларуская прадукцыя неканкурэнтаздольная (нават пры льготных коштах на расійскі газ) альбо яе няма. Гэта значыць, пасля задавальнення патрэбаў у выглядзе прадуктаў і паслуг першай ступені неабходнасці (прадукты, камунальныя паслугі), беларускі спажывец будзе траціць грошы на набыццё іншых тавараў, як то мэбля, бытавая тэхніка, аўтамабілі, камп'ютары, сотавыя тэлефоны. А гэта (акрамя, бадай, мэблі) пераважна імпарт.

Каб закупіць імпарт, патрэбна валюта. Каб купіць валюту, трэба абмяняць беларускія рублі на долары або еўра. Каб дазволіць беларусам спажываць імпарт, трэба мець дастатковы запас валюты. А валюта за проста так не бярэцца — яе трэба зарабіць. Зараблялі на нафце, калійных угнаеннях, металакордзе, у меншай ступені — на мазах-белазах, ліфтах, аўтапагрузчыках ды іншым. Але вытворчасць не развівалася ў бок дыверсіфікацыі, таму і прыток валюты не мог павялічыцца ў памеры, здольным кампенсаваць рост коштаў на энерганосьбіты, метал, камплектуючыя. Гаворачы вобразнай мовай, наш край стаў падобны на хранічна няўдалага гульца за картачным сталом, якому трэба ўвесь час падвышаць стаўкі ўдвая — у ліхаманкавай надзеі, што атрымаецца кампенсаваць мінулыя пройгрышы адным махам. Але эканамічныя законы куды больш жорсткія, чым картачныя.

Праўда, мусім прызнаць, што падставы для падобных прымітыўных ілюзій у нашай улады меліся, бо раней шанцавала. Найбольш удалы прыклад — прывязка нацыянальнай валюты з 2003 года да долара ЗША, калі Пётр Пракаповіч практычна здзейсніў мару Зянона Пазьняка пра «краіну талераў». Плаўнае аслабленне курсу амерыканскай валюты, зразумела, у тандэме з энерганосьбітнымі палёгкамі-прэферэнцыямі з боку Расіі паспрыялі захаванню мінімальна дапушчальнага ўзроўню экспартнага патэнцыялу Беларусі. Плюс да гэтага шалёны попытны патэнцыял расійскага бізнесу, які меў падпітку ад экспартных сыравінных нафтавых, газавых і металавых звышпрыбыткаў з прычыны імклівага росту кітайскай ды індыйскай эканомік (якія запатрабавалі ладную колькасць рэсурсаў) ды ўвядзення заходніх войскаў у Ірак і Афганістан.

Але бясконца так працягвацца не магло. Наступствы патрабаванняў кіраўніка дзяржавы падвышаць аб'ёмы вытворчасці ў першым паўгоддзі 2008 года праявіліся цяпер як неабходнасць збыць прадукцыю беларускіх прадпрыемстваў, выробленую мінулым годам, ніжэй за сабекошт. І нават па гэтых коштах яна нецікавая спажыўцу. Бо метал і камплектуючыя былі закупленыя ў пік коштаў на іх. А сёлетняя прадукцыя канкурэнтаў для парадзелых шэрагаў спажыўцоў куды больш прывабная. Гульня «выспачка стабільнасці» падыходзіць да лагічнага канца...

### Уяўны дабрабыт

Назіраўся своеасаблівы падман насельніцтва. З аднаго боку, дэкларавалі рост заробкаў, з іншага — падаткі заставаліся на высокім узроўні, раслі мыты, касаваліся палёгкі. У выніку лішкі грошай пачалі адбірацца альбо іх даводзілася траціць на тое, на што раней былі льготы. Рэальны ўзровень жыцця рос значна павольней дэклараванага імклівага росту краіны. А сабраныя падаткі, якія былі «ніякімі грашамі», у значнай ступені ляжалі мёртвым грузам. Іх няма куды траціць, дый нельга, бо можа здарыцца «вялікі чорны панядзелак рэжыму», калі народ паваліць забіраць свае лішкі з рахункаў беларускіх банкаў і купляць на іх замежную валюту.

**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Фільм «Утаймаванне свавольнай».
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Спадарыня поспех».
**17.10** Фільм «Белае сонца пустыні».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Фільм «Белае сонца пустыні». Працяг.
**19.00** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Што? Дзе? Калі?» у Беларусі. Летняя серыя гульняў.
**22.20** Фільм «12».
**01.20** Нашы навіны.
**01.35** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Гаішнікі». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Дарагая перадача».
**10.55** «Танга ўтрох». Тэленавэла.
**11.45** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**12.40** «Званая вячэра».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Асабісты інтарэс»..
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Сіла прыцягнення». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** КВЗ. Першая ліга. 1/4 Фіналу.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**23.40** Фільм «Макараў». Расія, 1993 г.

**06.55** «ЛАДная раніца».
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Згон» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.05** Час футболу.
**10.35** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.20** «Лабірынты: Грыгорый Цамблак - мітрапаліт Кіеўскі».
**11.45** Дэтэктыўны серыял «Двайняты» (Расія). 4-я серыя.
**12.40** Серыял «Адно каханне душы маёй» (Расія).
**13.35** Мультсерыял «Русалачка» (ЗША).
**14.00** Пазакласная гадзіна.
**14.15** Школа рамонту.
**15.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**16.20** Медычныя таямніцы.
**17.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.00** Навіны культуры.
**18.15** Усё аб бяспецы.
**18.45** Бітва экстрасэнсаў.
**19.50** Калыханка.
**20.10** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**22.05** Экспедыцыя.
**22.10** Камедыйная меладрама «Уся праўда аб каханні» (Вялікабрытанія).

**РОССИЯ**

**06.50** Фільм «Пётр Першы».
**10.35** Тэлесерыял «Карменіта».
**12.10** Тэлесерыял «Тэрмінова ў нумар-2», Расія, 2008 г.
**13.00** «Трымай мяне мацней». Тэлесерыял.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** Тэлесерыял «Трое супраць усіх-2».
**15.10** Фільм «Той самы Мюнхгаўзен».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Фільм «Той самы Мюнхгаўзен». Працяг.
**17.50** «Песня года». Частка першая.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Песня года». Частка першая. Працяг.
**21.00** «Расія маладая».
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** Фільм «Неадстраляная музыка».
**00.25** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**06.25** Музычная камедыя « Вясёлыя рабяты».
**08.00** «Сёння».
**08.15** «Крамлёўскія пахаванні».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.15** «Шнур вакол свету».
**10.45** «Авіятары».
**11.15** Прэм'ера. «Споведзь юбіляра».
**12.05** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дзеці белай багіні».
**16.00** Сёння.
**16.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дзеці белай багіні».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**21.35** «Рускія сенсацыі». Лепшае.
**23.15** Прэм'ера. Драматычны трылер « Пяць невядомых».
**00.40** Трылер «Крык».

**EUROSPORT**

**09.35** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Часопіс.
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Прэв'ю.
**10.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету-2010 у ПАР. Нідэрланды - Нарвегія.
**11.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету-2010 у ПАР. Швецыя - Мальта.
**12.15** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Ліберэ» (Францыя). 5-ы этап.
**13.30** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Дзень 4-ы.
**14.30** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Чвэрцьфінал. Прамая трансляцыя.
**16.15** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Ліберэ» (Францыя). 6-ы этап. Прамая трансляцыя.
**17.30** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Чвэрцьфінал. Прамая трансляцыя.
**21.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Фінал. Прамая трансляцыя.
**23.45** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 1-ы.
**00.15** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету-2010 у ПАР. Нідэрланды - Нарвегія.
**01.15** Вось дык так!!!
**01.30** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету (Мальта). Клас Р1.
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 1-ы.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял.
**19.00** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**19.30** Невядомая Беларусь: «Дай у рай, маці, ключы», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.45** «Minsk-Mixt–2008», ч. 2: канцэрт гурта «Фляўс і Кляйн».
**20.15** Рэпартэр (інфармацыйная праграма).
**20.40** Кінастужка (агляд кінарынку).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.15** Госць «Белсату».
**21.30** «Girl guide», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**23.05** «Апошні сезон», серыял.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

## 13 ЧЭРВЕНЯ, СУБОТА

**06.20** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.50** Брытва Окама.
**07.15** Існасць.
**07.40** Дзень спорту.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**08.55, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00** Навіны.
**09.05** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**09.35** Здароўе.
**10.05** Шпілька.
**10.40** Ранішняя хваля.
**11.15** «OFF STAGE LIFE».
**11.30** «Будні чэмпіёнаў».
**12.20** Лірычная камедыя «Дзяўчаты» (СССР).
**14.10** Дакументальны цыкл «Мая праўда. «Сёмае неба Мікалая Рыбнікава» (Украіна).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.15** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**16.35** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**17.00** «Любімы небеларускі акцёр». Пётр Алейнікаў. Мастацка- публіцыстычны тэлефільм (Беларускае тэлебачанне).
**17.45** Відэафільм АТН «Веткаўская старавера» цыклу «Зямля беларуская».
**18.20** «Ваша лато».
**19.10** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.20** Прэм'ера. Меладрама «Толькі вярніся» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.45** Біяграфічны прыгодніцкі фільм «Самы хуткі «Індыян» (ЗША-Новая Зеландыя).
**00.00** Уласнай персонай.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.35** «Здароўе».
**10.20** «Смак».
**11.00** «Князь Уладзімір». Анімацыйны фільм.
**12.20** Камедыя «Прыгоды зубнога лекара».
**13.45** Тэлечасопіс «Саюз».
**14.15** «Кінаметры вайны».
**14.45** «Вясельная ноч». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Вялікая палітыка.
**16.50** Прэм'ера. «Валянцін Смірніцкі. Больш, чым Партос».
**17.50** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.45** Прэм'ера. «Я кахаю вас!». Юбілейны вечар Л.Зыкінай.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Пражэктарпэрысхілтан».
**21.45** «Што? Дзе? Калі?».
**23.05** Меладрама «Канец раману».
**00.50** Трылер «Пасля дажджу».

**06.40** «Анфас».
**06.55** «Турысты». Камедыйны серыял.
**08.30** Фільм «Казакі-разбойнікі». СССР, 1979 г.
**09.35** «Я - вандроўца».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**10.55** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Новыя падарожжы дылетанта».
**13.00** Фільм «Вязень замка Іф». СССР, 1988 г. 1-я і 2-я серыі.
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.20** «Наша справа».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**17.20** «Нашы рэкорды».
**18.10** «Top Gear. Руская версія».
**19.05** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Азартныя гульні». ЗША, 2000 г.
**22.05** Канцэрт М.Задорнава.
**23.10** Фільм «Элемент злачынства». Данія, 1984 г.
**00.50** Фільм «Адкрыцці». ЗША, 2003 г.

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.15** Серыял для дзяцей «Філ з будучыні» (ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Таемны густ.
**10.35** Школа рамонту.
**11.35** Невытлумачальна, але факт.
**12.30** «Лабірынты: крэпасць над Днястром».
**13.00** Запал па культуры. Ток-шоў.
**13.45** Жаночая ліга.
**14.10** Авантурная камедыя «Залатое цяля» (Расія). 1-3 серыі.
**16.55** Гандбол. Адборачны матч чэмпіяната Еўропы. Беларусь - Балгарыя. Прамая трансляцыя.
**18.30** Жаночая ліга.
**19.05** Гісторыка-прыгодніцкі баявік «Апошні легіён» (Вялікабрытанія-Італія-Францыя).
**21.00** Прыгодніцкая камедыя «Шэсць дзён, сем начэй» (ЗША).
**23.00** Казанова.
**23.25** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь-Аўстрыя.

**РОССИЯ**

**07.00** Весткі.
**07.10** Фільм «Гісторыя аднаго кахання».
**08.40** Мультфільм.
**08.50** «Суботнік».
**09.30** «Ранішняя пошта».
**10.05** «Мой срэбны шар».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Пакой смеху».
**13.05** Тэлесерыял «Каменская».
**14.00** Весткі.
**14.20** Прэм'ера. «Казакі».
**15.15** Вострасюжэтны фільм «Атрад «Д».
**16.45** «Песня года». Частка другая.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Песня года». Частка другая. Працяг.
**20.15** Прэм'ера. Фільм «Насуперак разумнаму сэнсу». 2008 г.
**22.05** Прэм'ера. Фільм «Вакацыі кахання». 2008 г.
**23.50** Фільм «Вар'яцкі дзень манцёра».
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**НТВ**

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Рускія не здаюцца!».
**09.00** «Агляд».
**09.25** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.15** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.15** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дзеці белай багіні».
**16.00** Сёння.
**16.10** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Дзеці белай багіні».
**19.00** Сёння.
**19.25** Вострасюжэтны серыял «Мент у законе».
**21.30** Рускія сенсацыі». Лепшае.
**23.15** Фільм «Ваўкадаў».

**EUROSPORT**

**09.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Warm-Up. Прамая трансляцыя.
**10.15** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 1-ы.
**10.45** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Легенды. Прамая трансляцыя.
**11.45** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Ліберэ» (Францыя). 6-ы этап.
**13.00** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Фінал.
**14.30** Аўтагонкі. Сусветная серыя Renault у Венгрыі (Будапешт). 1-я гонка. Прамая трансляцыя.
**15.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Прамая трансляцыя.
**16.30** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Ліберэ» (Францыя). 7-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.15** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** Тэніс. Турнір АТР у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Паўфінал.
**20.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Прамая трансляцыя.
**21.30** Конны спорт. Турнір Global Champions у Францыі (Каны). Прамая трансляцыя.
**23.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 2-і.
**23.30** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Прамая трансляцыя.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**18.00** Аб'ектыў (навіны, 1 выданне).
**18.10** Тыдзень з радыё «Свабода» (аналітычная праграма).
**18.40** «Закаханыя ў Мінску», дак фільм, 2003 г., Германія.
**20.10** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.35** Кухня (музычна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (навіны, галоўнае выданне).
**21.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Дзеці пірамiды», дак. фільм, 2007 г., Польшча.
**21.45** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**22.10** Суботні сеанс: «Бездакорныя анёлкі», маст. фільм, 1998 г., Канада–ЗША.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.
**00.00** Аб'ектыў (навіны).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 14 ЧЭРВЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.50** Сямейны серыял «Мая мама - ветэрынар» (Германія).
**08.25** Альманах вандраванняў.
**08.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.25** Культурныя людзі.
**10.55** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.00** Навіны.
**12.10** Рамантычная драма «Мой ласкавы і пяшчотны звер» (СССР).
**14.05** Хранікальна-дакументальны фільм «Партызан Уладзімір Дубінін» цыклу «Вялікай Перамогі Салдаты» (Беларускае тэлебачанне).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**15.35** Nota Bene.
**16.05** Фантастычны серыял «Паверхня» (ЗША).
**17.50** Суперлато.
**18.45** Камедыя «9 прыкмет здрады» (Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.05** X Нацыянальны фэст беларускай песні і паэзіі «Маладзечна- 2009». Гала-канцэрт.

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.50** «Шалапутныя нататкі».
**10.10** Пакуль усе дома.
**11.00** Фазэнда.
**11.35** «Разумніцы і разумнікі».
**12.20** «Садко Багаты», «Дабрыня Нікіціч».
**13.00** Прэм'ера «Упалыя з неба».
**13.30** «Мотафрыстайл. Сусветная серыя».
**14.30** Камедыя «Самая абаяльная і прывабная».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Вечны Рамэа».
**17.30** «Цвіль».Дакументальны фільм.
**19.10** АНТ прадстаўляе: «Рэкламная паўза».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. «Вялікая розніца».
**22.10** Фільм «Платон». Расія, 2008 год.
**23.55** «Ціхі дом» на «Кінатаўры».

### СТВ

**06.30** «Праверана на сабе».
**07.15** «Турысты». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм «Шпік пецярбургскай паліцыі». Расія, 1992 г.
**09.30** «Добры дзень, доктар!».
**10.00** Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.55** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.30** «Аўтапанарама».
**13.00** Фільм «Вязень замка Іф». СССР, 1988 г. Заключная серыя.
**14.45** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі».
**17.55** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Навошта мы жэнімся?». ЗША, 2007 г.
**22.40** «Спартыўны тыдзень».
**23.00** «Сусветны бокс».
**23.50** «Поўня». Серыял.

### ЛАД

**08.10** Дабравест.
**08.40** Мір вашай хаце.
**08.50** Бухта капітанаў.
**09.30** Наша пяцёрачка.
**10.00** Мультфільм.
**10.20** Музычная камедыя «Джэк Васьмёркін - амерыканец» (СССР).
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.00** Сезон ля дачы.
**12.40** Пасоўванне+.
**12.55** «XXI у XXI стагоддзі». Міжнародны фэст сучаснай харэаграфіі ў Віцебску.
**13.20** Мастацка-публіцыстычны фільм «Гісторыя аднаго горада» (Беларускае тэлебачанне).
**13.50** Авантурная камедыя «Залатое цяля» (Расія). 4-8 серыі, заключныя.
**17.55** Камедыйны серыял «Дурнушка Бэці-2» (ЗША). 1-я серыя.
**18.45** Фантастычная камедыя «Бітлджус» (ЗША).
**20.25** Тэлебарометр.
**20.45** Экспедыцыя.
**21.20** Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны.
**23.05** «Правы чалавека».
**23.20** Свая музыка.
**23.45** Пасоўванне+.
**00.15** Валейбол. Еўраліга. Мужчыны. Беларусь - Аўстрыя.

### РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Залюстаркоўе». Дакументальны фільм.
**07.40** Фільм «Лётчыкі».
**09.00** Дэтэктыў «Следствам усталявана».
**10.30** «Смехапанарама».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.00** «Медычная таямніца. Крамлёўскі лекар». Дакументальны фільм.
**13.00** Тэлесерыял «Каменская».
**14.00** Весткі.
**14.20** Камедыя «Сватаўство гусара».
**15.40** Фільм «Я буду чакаць...».
**17.10** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.35** «Танцы з Зоркамі». Сезон-2009.
**22.40** Прэм'ера. Фільм «Цячэ рака Волга». 2009 г.
**00.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** « Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.15** «Выратавальнікі».
**10.45** «Прафесія-рэпарцёр».
**11.15** «Авіятары».
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Вострасюжэтны серыял « Псеўданім «Албанец».
**16.00** Сёння.
**16.15** Вострасюжэтны серыял « Псеўданім «Албанец».
**19.00** Сёння.
**19.25** Вострасюжэтны серыял « Псеўданім «Албанец».
**21.10** Рускія сенсацыі». Лепшае.
**23.00** Дэтэктыўная меладрама «Чорная архідэя».
**01.05** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**04.00** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Прамая трансляцыя.
**12.00** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Лібэрэ» (Францыя). 7-ы этап.
**13.15** Аўтагонкі. Сусветная серыя Renault у Венгрыі (Будапешт). 2-я гонка. Прамая трансляцыя.
**14.15** Аўтаспорт. Гонка «24 гадзіны Ле Мана» у Францыі. Прамая трансляцыя.
**16.15** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Лібэрэ» (Францыя). 8-ы этап. Прамая трансляцыя.
**18.00** Тэніс. Турнір ATP у Вялікабрытаніі (Лондан). Каралеўскі клуб. Фінал.
**19.30** Футбол. Моладзевы фэст да 21 года ў Францыі (Тулон). Фінал.
**21.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі МБФ у ЗША.
**23.30** Мотаспорт па выходных.
**23.45** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 3-і.
**00.15** Веласпорт. Велагонка «Крытэрыум Дафінэ-Лібэрэ» (Францыя). 8-ы этап.
**01.45** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Акрапаліс» у Грэцыі. Дзень 3-і.
**02.15** Мотаспорт па выходных.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**18.00** Прэс-экспрэс.
**18.15** «Элі Макбіл», тэлесерыял.
**19.05** Жаўтуха (сатырычная праграма).
**19.35** «Дзе мае бацькі? Пакінутыя дзеці ў Румыніі», дак. фільм, 2008 г., Румынія.
**20.10** Форум (ток-шоу): Куды пайсці вучыцца?
**21.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).
**21.20** «Гісторыя пад знакам Пагоні»: «Крыжакі».
**21.25** «Акно ў Еўропу» (інфармацыйная праграма).
**21.50** Фільматэка майстроў: «Дэраў», біяграфічная драма, 1991 г., ЗША.
**23.35** XIV Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Бардаўская восень–2007»: «WZ-Аркестр», ч. 2.
**00.00** Аб'ектыў (вынікі тыдня).

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

ВЫБАРЫ

# ТРЫ ДНІ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ БРЫТАНІЮ

Алег НОВІКАЎ

**Сярод галоўных сенсацый, якія здольныя прынесці вынікі бліжэйшых выбараў у Еўрапарламент, — магчымы праход у заканадаўчы орган ЕС Брытанскай нацыянальнай партыі.**

Жыхары Брытаніі шануюць дэмакратычныя інстытуты сваёй краіны, і ў тым ліку вельмі ганарацца тым, што ў 1930-я гады Англія не заразілася эпідэміяй фашысцкага грыпу, якая ахапіла амаль усе краіны па той бок Ла-Маншу. Нягледзячы на крызіс гаспадаркі і актыўную дзейнасць у краіне Саюза брытанскіх фашыстаў, у Вялікабрытаніі ўзяла верх традыцыя дэмакратыі. Больш таго, Вялікабрытанія амаль два гады — з верасня 1939 па чэрвень 1941 года — сам на сам супрацьстаяла ўсёй падкантрольнай фашыстам Еўропе і ўпарта, нягледзячы на мірныя прапановы з боку Берліна, адмаўлялася ад хоць нейкіх кампрамісаў.

Напярэдадні выбараў у Еўрапарламент стары міф пра імунітэт брытанцаў да фашызму на вачах пачынае знікаць.

Нагадаем, што ад Аб'яднанага Каралеўства ў Еўрапейскі парламент абіраецца 72 дэпутата. Выбары ў парламент ЕС, у адрозненні ад выбараў у Палату абшчын, праходзяць па прапарцыйнай сістэме, што дае шанцы для малых партый.

На апошніх выбарах перамогу святкавалі кансерватары (26 працэнтаў і 27 месцаў). Галоўным сюрпрызам тады быў поспех антыеўрапейскай Партыі незалежнасці Аб'яднанага Каралеўства (UKIP). UKIP атрымала 16 працэнтаў, што прынесла 12 мандатаў. Перамога UKIP, аднак, не вельмі турбавала грамадства. Гэты праект разглядаўся як сімвалічны пратэст супраць інтэграцыі.

У гэтым годзе грамадства больш уважліва сочыць за выбарамі ў парламент ЕС і за перспектывамі малых партый. Ёсць пагроза, што ў Бруселі будуць праціраць штаны кандыдаты ад Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP).




Постэр кандыдата ў дэпутаты Еўрапарламента ад Сацыял-дэмакратычнай партыі Адрыяна Северына ў Бухарэсце

Брытанская нацыянальная партыя ўзнікала ў 1980 годзе ў выніку расколу ў іншай праварадыкальнай партыі пад назвай Нацыянальны фронт. Цікава, што прычынай расколу ў тым ліку былі розныя погляды на пытанне пра тое, ці могуць гомасексуалісты займаць урадавыя пасады. Бацькі-заснавальнікі BNP казалі: «не». Іх апаненты — «так».

Адпаведна праграме, BNP выступае за прыпыненне каляровай эміграцыі і рэстаўрацыю сітуацыі, якая склалася ў Вялікабрытаніі да 1948 года. BNP таксама патрабуе, каб людзі, што прыехалі калісьці на Альбіён, паступова вярталіся на радзіму. Ёсць у праграме партыі і дастаткова экзатычныя патрабаванні. Напрыклад, аднаўленне ў школах цялесных пакаранняў і дазвол грамадзянам мець зброю.

Пасля прыходу BNP да ўлады кожная партыя павінна будзе забараніць сяброўства для іншаземцаў (да гэтай групы, праўда, не належаць белыя эмігранты). І гэта не жарт. У 2002 годзе паклаў на стол партыйны білет адзін з мясцовых кіраўнікоў BNP за тое, што яго сяброўка была эмігранткай з Эквадора. Раней партыя была вядомая сваімі антысеміцкімі заявамі. Аднак у 2005 годзе, пасля выбухаў у Лондане, арганізаваных ісламскімі тэрарыстамі, усе змянілася. Галоўным казламі адпушчэння цяпер сталі эмігранты ісламскага веравызнання. Партыя нават піярыць факт наяўнасці ў сваіх шэрагах сяброў з яўрэйскіх сямей.

BNP доўгі час знаходзілася ў самай нізкай лізе брытанскай палітыкі, пакуль у 1992 годзе яе кандыдат нечакана не атрымаў 20 працэнтаў галасоў на выбарах у муніцыпалітэт горада Мілуал. Падзея мела вялікі рэзананс. 15 тысяч чалавек антыфашысцкіх поглядаў у адказ спрабавалі штурмаваць офіс нацыяналістаў у сталіцы. Шуміха вакол BNP у прэсе прынесла ёй імідж галоўнай партыі правага радыкальнага спектру.

З 1995 года партыяй кіруе былы выпускнік Кембрыджу Нік Грыфін. Ён абвясціў курс на мадэрнізацыю BNP, сутнасць якой — пашырэнне сацыяльнай базы партыі, асабліва за кошт працоўных і прадстаўнікоў сярэдняга класу.

Аднак канчаткова зламаць стэрэатып не ўдалося. Прыклад таму — учынак акцёра Джона Рыса-Дэвіса. Ён вядомы ўсім па ролі гнома Гімлі ў эпапеі «Уладар пярсцёнкаў». Пасля выхаду на экраны фільма акцёр заявіў, што барацьба эльфаў, гномаў, хобітаў у тым фільме і ёсць не што іншае, як праекцыя барацьбы белай цывілізацыі супраць навалы іншаземных культур. BNP адразу прапанавала яму сяброўства, аднак Джон Рыс-Дэвіс катэгарычна адмовіўся.

Наступныя лакальныя выбары 2005 года прынеслі нацыяналістам 12 мандатаў дэпутатаў мясцовых саветаў у раёнах, якія традыцыйна лічыліся электаральнымі бастыёнамі лейбарыстаў. На мясцовых выбарах 2007 года яны мелі ўжо 47 муніцыпальных парламентарыяў. У 2008-м здолелі правесці аднаго дэпутата ў Раду Лондана.

Выбарчыя поспехі, праўда, хутка абвастрылі ўнутраныя адносіны. У 2007 годзе 60 супрацоўнікаў апарату партыі былі выключаныя Грыфінам за быццам бы працу ў якасці шпіёнаў на левыя партыі. Хутчэй за ўсё, мела месца банальнае сутыкненне асабістых амбіцый. Інакш тыя, каго выкінулі з шэрагаў партыі, не стварылі б адразу сваю палітычную фармацыю «Новы ўсход Брытанскай нацыянальнай партыі» (*New Dawn For the British National Party*).

Часткова з наступствамі таго расколу звязваюць скандал у лістападзе 2008 года, калі ў інтэрнэце з'явілася база дадзеных сяброў BNP. Прозвішчы, адрасы прафесіі. Сярод дзесяці тысяч сяброў BNP аказалася шмат афіцэраў паліцыі (сяброўства ў BNP афіцыйна забаронена для ахоўнікаў парадку).

Цяперашні эканамічны крызіс стаў папросту маннай нябеснай для нацыяналістаў. Яны запусцілі кампанію «Працоўныя месцы ў Брытаніі — брытанскім працоўным!». Другім важным чыннікам стаў нядаўні карупцыйны скандал з удзелам дэпутатаў парламента.

Цяпер уся прагрэсіўная Англія на вушах. Усе разумеюць, што справа ідзе пра ўваход нацыяналістаў у палітычны істэблішмент, выхад на публічныя фонды ЕС. Створана нават шырокая кааліцыя, якая агітуе супраць правых радыкалаў. Так, архіепіскап кентэрберыйскі заявіў, што «будзе трагедыяй, калі людзі прагаласуюць за BNP». Лідэр кансерватараў Дэвід Камерун назваў сяброў BNP «фашыстамі» і заклікаў не даваць ім ніводнага голасу. «У нас ёсць толькі тры дні, каб выратаваць Брытанію», — піша «The Times».

Чакаць развязкі сапраўды засталася надоўга. Між іншым, сярод англійскіх палітолагаў ёсць група дзівакоў, якія, наадварот, хацелі б перамогі BNP. Толькі такім чынам людзі пераканаюцца, кажуць яны, што кіраваць краінай нацыяналісты не здольныя.




## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Ужо на наступным тыдні ЗША прымуць рашэнне пра захаванне або ануляцыю санкцый супраць Беларусі. NATO лічыць Беларусь патэнцыйнай пагрозай для суседняй Літвы. «Freedom House» ставіць Беларусь на 188-е месца з 195 краін па ступені захавання праў чалавека, а «*Transparency International*» лічыць, што карупцыі ў Мінску больш, чым у Маскве. ЗША і ЕС павінны будаваць адносіны з Беларуссю, зыходзячы з неабходнасці дэмакратызацыі і спадзяваннаў на рэформы палітычнага ладу. Няхай Вашынгтон не паддаецца спакусе задавальняцца тым, што ў Мінск вернецца ягоны пасол. Адмена амерыканскіх санкцый павінна адбыцца выключна на канкрэтных умовах.

**«The Wall Street Journal» (ЗША)**

Калі прэзідэнт Мядзведзеў раздражнёна адгукаецца пра «Усходняе партнёрства», то можна сабе ўявіць, што адбываецца ў душы прэм'ера, які мусіў весці справы з Лукашэнкам увесь час, пакуль быў прэзідэнтам. І раптам для апошняга, які адпрэчаны Захадам і які ўвесь час кляўся ў вернасці Расіі, прыдумалі нейкае партнёрства. Сказаць можна толькі адно: ну што, Бацька, дапамаглі табе твае ляхі. Хутка, Аляксандр Рыгоравіч, у цябе, кажучы не па-гогалеўску, не будзе бабла. Глядзі ў дадатку аналіз міністра фінансаў Расійскай Федэрацыі.

**«Грани» (Расія)**

Мемарандум, які рыхтуе апазіцыя, — адзнака глыбокага крызісу ўнутры самой апазіцыі. У беларускай апазіцыі склалася унікальная сітуацыя, калі пад адзін дах загналі камуністаў і нацыяналістаў. Такім чынам, размова ішла не пра аб'яднанне людзей па праграмных або ідэйных забабонах, а папросту дзейнічалі па прынцыпу: мы ўсе супраць прэзідэнта. Натуральна, калісьці гэта гісторыя павінна была скончыцца.

**«Коммерсантъ» (Украіна)**

Масква даказала двайную гульню Беларусі ў адносінах з Расіяй. Лукашэнка і далей кажа, што збіраецца будаваць саюзную дзяржаву, аднак на практыцы Беларусь стала сябрам «Усходняга партнёрства», да гэтага часу не прызнала незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі, адмаўляецца фінансаваць антыкрызісны фонд «ЕўрАзЭС».

**«ВВС» (Вялікабрытанія)**

Фарсіраванае беларускімі ўладамі будаўніцтва АЭС неадназначна ўспрымаецца насельніцтвам краіны. ...Нават грамадскія арганізацыі, патронам якіх выступае ўлада, не маюць праўдзівай і аб'ектыўнай інфармацыі пра пагрозы «мірнага атаму». Аналітыкі не выключаюць, што адтэрміноўка пачатку будаўніцтва станцыі, якая выклікана фінансавымі праблемамі, а таксама спрэчкамі паміж Мінскам і Масквой, здольная даць новы імпульс дыскусіям пра мэтазгоднасць будаўніцтва АЭС у Беларусі.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Цяпер адмоўнае сальда гандлёвага балансу Беларусі складае каля 13 працэнтаў ад ВВП. Лічба дастаткова нармальная, аднак выключна па дакрызісных параметрах. Тады такую розніцу можна было лёгка ліквідаваць за кошт інвестыцый. Зараз жа інвестары яўна не спяшаюцца ўкладаць нават капейку ў эканомікі краін, якія развіваюцца. Таму пазбегнуць фінансавага краху можна выключна за кошт іншаземных крэдытаў.

**Лента.ру (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КІТАЙ. МАСАЖЫСТКА — ГЕРОЙ АНТЫКАМУНІСТАЎ

Дэн Юйцзяа — яшчэ ўчора была шэрай супрацоўніцай масажнага салона ў адным з гарадоў паўднёвага Кітая, які аказваў кліентам паслугі, у тым ліку інтымнага характару. Прычым кліентура была незвычайная — бонзы Кампартыі, супрацоўнікі вертыкалі і г. д. Сёння яна — гераіня нацыі, або, дакладней кажучы, феміністак і той часткі кітайцаў, якія ненавідзяць камуністаў. 10 мая ў сталіцы правінцыі Хубэй масажыстка забіла 39-гадовага функцыянера Кампартыі, які, па словах Дэн, хацеў яе згвалціць. Пракуратура, аднак, сцвярджае, што дзяўчына забіла апаратчыка свядома, хаця сведкі кажуць, што Дэн папросту абаранялася. Навіна пра забойства выйшла за межы правінцыі, і нават рамкі інтэрнэт-форумаў. У пекінскім універсітэце студэнты арганізавалі маленькую маніфестацыю пад лозунгам «Кожны можа стаць Дэн». Цэнтральныя ўрадавыя органы, напалоханыя маштабамі пратэсту, нават загадалі рэдакцыям газет больш не асвятляць працэс па справе Дэн. Горад, дзе мусіць адбывацца суд над дзяўчынай, ужо пераведзены на спецыяльны паліцэйскі рэжым. Два журналіста з Ганконгу, якія паспрабавалі зрабіць адтуль рэпартаж, былі жорстка збітыя невядомымі.

**По матэрыялах «Tageszeitung» (Германія)**

### ПАЎНОЧНАЯ ІРЛАНДЫЯ. ЗАБОЙСТВА КАТАЛІКА НАПЯРЭДАДНІ СЕЗОНУ ПАРАДАЎ



Уся Вялікабрытанія зноў уважліва сочыць за Паўночнай Ірландыяй, дзе ўстанавіўся нетрывалы мір паміж каталікамі і пратэстантамі. І бывае ж такое: літаральна напярэдадні так званага сезону парадаў (рытуальныя маніфестацыі пратэстанцкіх арганізацый у гонар перамогі пратэстантаў над каталікамі ў 1690 годзе, якія часта прыводзілі да беспарадкаў) у Белфасце аранжыстамі быў забіты каталік. Гэта 49-гадовы супрацоўнік сацыяльных службаў. Ён стаў ахвярай банды футбольных хуліганаў, якія падтрымліваюць клуб «Rangers» з Шатландыі. Справа ў тым, што Паўночная Ірландыя — невялікая правінцыя, і ўзровень футболу тут нізкі. Мясцовыя фаны аддаюць перавагу турніру ў Шатландыі, дзе тон задаюць клубы «Celtic» (за яго балеюць эмігранты з Ірландыі і каталікі) і «Rangers» (за яго звычайна балеюць пратэстанты). Паколькі ў гэтым годзе «Rangers» перамог, ягоныя фанаты вырашылі адсвяткаваць гэта ў каталіцкім раёне Белфаста і ва ўгары забілі чалавека. Цяпер мяч на баку каталікоў. Усе баяцца, што ірландскія радыкальныя групоўкі могуць пачаць вендэту, справакаваўшы працяг канфлікту. Дэпутат раёна, дзе адбылася трагедыя, заклікаў палітыкаў краю тэрмінова прыехаць сюды і стрымаць эмоцыі людзей. Пакуль гэта прыносіць поспех. Лідэры аранжыстаў, напрыклад, адмовіліся праводзіць ужо запланаваны на гэты уік-энд марш.

**Па матэрыялах «Liberation» (Францыя)**



### АРМЕНІЯ — АЗЕРБАЙДЖАН. ТУРНІР НА СПРЭЧНАЙ ТЭРЫТОРЫІ

Хто не ведае, існуе так званы футбольны турнір журналістаў СНД. Кожны год ён праводзіцца ў адной з краін Садружнасці. А ў гэтым годзе арганізатары дадумаліся правесці яго ў Нагорным Карабаху, які фармальна належыць Азербайджану, а фактычна ёсць пратэктаратам Арменіі. Турнір прайшоў пад асабістым патранажам прэзідэнта сепаратысцкай рэспублікі Бака Саакяна. Перамаглі гаспадары. Аднак гэта была толькі прэлюдыя палітычнага скандалу. Як трэба было прагназаваць, Азербайджан выступіў як супраць турніру, так і яго асвятлення ў прэсе. Вось фрагмент каментара аднаго азербайджанскага журналіста: «Заклікаю суайчыннікаў схаваць нервы. Калі турнір правялі, то, значыць, на нейкіх палях. Выснова — палі ёсць. Ужо добра. Будзе дзе гуляць у футбол нашым дзецям».

Праз пэўны час армянскія СМІ паведамілі, што нейкія людзі з Баку прымусілі вядомага спартовага каментара Васіля Уткіна, вядучага праграмы «Футбольны клуб» на НТВ, не дэманстраваць ролік пра спаборніцтвы журналістаў, пагражаючы ў іншым выпадку не дапусціць каманду каналу на матч Азербайджан — Расія. Сам Васіль заявіў, што ніхто яму не пагражаў. Аднак, мяркуючы па яго супярэчлівых словах, ні ён, ні каманда НТВ, якая ўдзельнічала ў турніры, самі не ведалі, у якую гісторыю яны патрапілі. Цяжка прагназаваць, што магло б здарыцца, калі б менавіта дружына НТВ перамагла ў тых спаборніцтвах.

**Па матэрыялах азербайджанскіх СМІ**

ЦІКАВА



# ІХ НОРАВЫ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Былы зяць прэзідэнта Казахстана Рахат Аліеў, які пасварыўся з Назарбаевым і эмігрыраваў на Захад, апублікаваў скандальную кнігу пра сакрэты назарбаеўскага двара. Афіцыйная Астана ўжо адрэагавала на навінку кніжнага рынку: генпракурор краіны прыгразіў кожнаму казаху, які прачытае, набудзе або распаўсюдзіць кнігу Аліева, крымінальным артыкулам. Пытанне: за што?**

Па-сутнасці, кніга Аліева «Хросны цесць» — гэта кароткі курс найноўшай гісторыі Казахстана. На думку аўтара, галоўным чыннікам гэтай гісторыі была эвалюцыя поглядаў і нормаў паводзін Нурсултана Абішавіча Назарбаева.

Калі верыць Аліеву, то Назарбаеў — гэта прыроджаны двурушнік. Ён пачынаў кар'еру ў савецкія часы як выхадзец з рабочых. Апаратчыкі лічылі яго простым хлопцам, які ніколі не зможа гуляць першыя ролі. Аднак камсамолец Назарбаеў быў не такі просты. У кнізе згадваецца нейкі ліст, які малады Нурсултан быццам напісаў тагачаснаму сакратару Кампартыі Казахстана Кунаеву.

«Яго аўтар кляўся, што ніколі не здрадзіць свайму старэйшаму таварышу-правадыру. Заўсёды будзе браць з яго прыклад, кіравацца ягонымі ідэямі і пастулатамі вучэння Маркса — Леніна, дзеля якіх ён гатовы ахвяраваць усім», — піша Аліеў.

На думку аўтара кнігі, той ліст пакінуў у свядомасці Назарбаева глыбокі след. «Праз шмат гадоў Назарбаеў, які ўжо быў прэзідэнтам, увёў практыку напісання лістоў падобнага кшталту. Кожны чалавек з бліжэйшага атачэння прэзідэнта мусіў напісаць так бы мовіць «асабістую клятву гаспадару», — сцвярджае Аліеў.

Адрасат таго ліста — Кунаеў — думаецца, быў уражаны. Інакш у 1984 годзе Назарбаеў не атрымаў бы пасаду кіраўніка Савета міністраў Казахскай ССР. З пачаткам перабудовы, адчуўшы, што пачынаюцца вялікія перамены, Назарбаеў пачынае публічна крытыкаваць патрона. Такім чынам, ён робіцца сваім чалавекам у вачах Масквы, з падачы якой хутка становіцца кіраўніком рэспублікі. На момант распаду СССР гэта фактычна гарантавала пасаду кіраўніка маладой незалежнай дзяржавы.

Аліеў прызнае, што ў першыя гады незалежнасці Назарбаеў паводзіў сябе як і павінен лідэр дэмакратычнай краіны, аднак хутка прэзідэнт пачаў закручваць гайкі. У тым ліку гэта было выклікана зменамі ў сямейным атачэнні Назарбаева.

Яго першая жонка Сара Алсыпаўна не любіла аўтарытарных забабонаў мужа. Аліеў піша: «Гэта дзякуючы ёй (Сары) краіна да гэтага часу не абрасла залатымі бюстамі і гіганцкімі партрэтамі першага прэзідэнта. «Ты як хочаш, а я гэта трываць не збіраюся, нам не патрэбны тут культ асобы, як у Туркменіі», — казала яна падчас сямейных сустрэч. У майго цесця незадаволена выцягваўся твар, аднак пайсці супраць волі жонкі ён не рашаўся. Магчыма, будучы не ў стане змяніць сітуацыю ў сям'і, Нурсултан Назарбаеў вырашыў завесці новую сям'ю».

Хутка фаварыткай Нурсултана стала 26-гадовая бортправадніца Гульнара Ракішаева (Аліеў называе яе «казахская Памела Андэрсан»). Флірт з ёй нагадваў камедыю.

«З моманту пераезду ў Астану, прэзідэнт пачаў жыць на два дамы. Было цікава назіраць, як ён адпраўляецца да сваёй такал (маладой жонкі) поўным картэжам з мігалкамі, але пры гэтым збіраецца захаваць сувязь у строгім сакрэце. Пасля служба аховы прэзідэнта пачала мяняць нумары, аднак куды схаваеш картэж браніраваных чорных джыпаў», — успамінае Аліеў.

З часам казахская Памела Андэрсан нарадзіла Нурсултану дзве дачкі (усяго іх у яго пяць). Ён, у сваю чаргу, зрабіў яе віцэ-прэзідэнтам авіякампаніі «Эйр Астана».

«Аднак Нурсултану Назарбаеву і дзве сям'і падалося замала, — працягвае аўтар. — І ён пайшоў на рэкорд — ён адзіны ў сучаснай гісторыі кіраўнік дзяржавы, які жыве адначасова ў трох сем'ях».

Трэцюю пасію Нурсултана завуць Асель Імабаева (на момант пачатку рамана з прэзідэнтам ёй ледзь споўнілася 18 год). Менавіта Асель (каб падняць яе прэстыж у вачах прэзідэнта, сцвярджае Аліеў, яе штучна зрабілі міс Казахстана) рэалізавала даўнюю мару прэзідэнта, нарадзіўшы яму сына Султана. Як вядома, хлопчык быў зачаты ў прабірцы. Аліеў сцвярджае, што загад прымяніць сучасныя тэхналогіі даў асабіста ягоны былы цесць. Нур (мянушка Назарбаева) баяўся, што зноў нарадзіцца дзяўчынка. Дарэчы, чыноўнік, адказны за аперацыю па нараджэнню нашчадка, у якасці ўзнагароды атрымаў міністэрства спорту.

Што да былой сцюардэсы Гульнары, то яна з дочкамі зараз жыве на прэзідэнцкай віле ў Іспаніі. А першая жонка Сара даўно пераехала жыць у Алма-Ату.

Прэзідэнт паказаў сябе не толькі парушальнікам маральнага кодэксу будаўніка камунізму. На пачатку 1990-х пачала складвацца, паводле вызначэння Аліева, сістэма раскрадання багаццяў краіны. У перакладзе на афіцыйную тэрміналогію гэта называецца «кантраляваная прыватызацыя».

Формула кантраляванай прыватызацыі вельмі простая. Напрыклад, дзяржава вырашае

прыватызаваць прадпрыемства «Кармет». Аб'ектам цікавіцца індуская кампанія. Заключаецца здзелка паміж урадам і фірмай. Цяпер прадпрыемства фармальна належыць індускаму прадпрымальніку Міттау. На самай справе, палова акцый пасля набыцця «Кармету» перададзеная індусамі ў кампанію, якой валодае Нурсултан Абішавіч. Плюс апошні атрымаў 50 мільёнаў долараў «кэшам». Такія правілы, са слоў Аліева, дзейнічаюць для прадстаўнікоў замежнага бізнесу, якія хочуць працаваць у краіне.

Натуральна, такая схема можа працаваць ва ўмовах адсутнасці дэмакратычных інстытутаў, у тым ліку правамоцнага парламенту. Аліеў распавядае пра сістэму фальсіфікацый выбараў, якая склалася ў краіне.

Выдавецтва «Дауір», якое належыць родзічу Назарбаева, друкуе два абсалютна аднолькавых наклады бюлетэняў па замове Цэнтрвыбаркаму. Першы наклад адпраўляецца на выбарчыя ўчасткі і раздаецца выбаршчыкам. Тыя кідаюць паперкі ў скрыні для галасавання. Пасля гэтага ўсё, што ёсць у скрынях, ідзе на сметнік. Замест гэтага закладаецца другі наклад бюлетэняў, на якіх крыжыкі стаяць супраць патрэбнай уладзе кандыдатуры. Гэтыя бюлетэні запаўняюцца ў мясцовых аддзелах КНБ. Застаецца згадаць, што старшынёй выбарчай камісіі, як правіла, абіраецца дырэктар якога-небудзь дзяржаўнага прадпрыемства.

«Што яго (дырэктара) чакае, калі ён адмовіцца падпісваць дасланы зверху пратакол? На яго завядуць крымінальную справу за гандаль наркотыкамі або згвалтаванне школьніцы, у яго сына знойдуць улёткі «Хізб ут-Тахрыр» (радыкальная тэрарыстычная ісламская арганізацыя) і г. д. А калі на гэты момант ужо былы дырэктар пачне нешта казаць пра падмену бюлетэняў, яго адправяць у дом для вар'ятаў. Або арганізуюць аўтамабільную катастрофу. Галоўнае, каб была стабільнасць, як кажа наш пажыццёвы прэзідэнт», — сцвярджае Аліеў.

Аднак Назарбаеў, калі верыць Аліеву, у гэтай галіне аддае належнае тэхнічнаму прагрэсу: «А яшчэ ў нас ёсць перадавая тэхналогія электроннага галасавання «Сайлау». Яна нарадзілася, калі ў адміністрацыі палічылі, што механізм фальсіфікацыі выбараў з дапамогай друкарскіх станкоў тыпаграфіі «Дауір» надзейны, аднак складаны. У «Сайлау» ўсё вельмі проста. Выбаршчыкі націскаюць на тыя кнопкі, якія пажадаюць, а сістэма пакажа на маніторы тыя лічбы, якія ў кампутары загрузіць выбаркам. Сэрвер — двайнік сістэмы, які падключаны па кабелю да галоўнага сэрверу выбаркама, знаходзіцца ў спецыяльнай інфармацыйнай службе КНБ, літаральна ў ста кроках ад будынка выбаркама ў Астане».

Сама Астана — новая сталіца краіны — дарэчы, таксама, на думку Аліева, праява аўтарытарнай прыроды Назарбаева. Аліеў мяркуе, што праект пераносу сталіцы матываваны выключна страхам перад ліберальнай грамадскасцю Алма-Аты, комплексамі перад старой інтэлігенцыяй горада.

«Адна справа — сядзець у кабінеце ў цэнтры Алма-Аты, гэтага незразумелага прэзідэнту горада. Прычым сядзець у 100 метрах ад людской плыні, ад якой цябе аддзяляе хліпкі слой ахоўнікаў. І зусім іншая — аддаваць загады з далёкай дыстанцыі, калі цябе ад грамадзян аддзяляюць рэчка, вялікі стэп, байцы МУС, спецназу і служба аховы прэзідэнта, якая разраслася да 10 тысяч чалавек. Вось гэта сапраўдная бяспека!» — піша Аліеў.

Алах з той Астаною... Аліеў адстойвае версію, што Назарбаеў сістэматычна забівае сваіх грамадзян: «Забіваць рэжым Назарбаева пачаў даўно, яшчэ ў 1990-я. Першымі ахвярамі наёмных забойцаў Хроснага цесця сталі бандыты, якія канкуравалі з цэнтральнай уладай у галіне кантролю за структурамі бізнесу. Іх баяліся, ім плацілі падатак, іх слухалі. На старце 1990-х крымінальныя аўтарытэты часта мелі большы ўплыў, чым паралізаваная крызісам дзяржаўная машына... Хутка яны паплаціліся за свае амбіцыі жыццём. У краіне пачалася крымінальная вайна, у выніку якой не выжыў ніводны крымінальны аўтарытэт. Адпаведна афіцыйнай версіі, гэтую вайну вялі паміж сабой кланы. На самай справе, яе пачаў Хросны цесць.

Менавіта тады, сцвярджае Аліеў, быў пяройдзены рубікон: «Наступным крокам пасля ачысткі крымінальнай пляцоўкі стала забойства канкурэнтаў на палітычным полі».

Аліеў падрабязна аналізуе некалькі рэзанансных забойстваў, напрыклад, Сарсенбаева (адзін з лідэраў апазіцыі). Той паехаў на паляванне з шафёрам і ахоўнікам і не вярнуўся. Усіх забілі. Гісторыя проста анекдатычная. Забойцы, каб стварыць ілюзію рабаўніцтва, забралі ў нябожчыкаў мабільныя тэлефоны. Адзін з тых апаратаў забойца падараваў каханцы. Міліцыя хутка знайшла дзяўчынку. Якім жа было здзіўленне следчых, калі яны даведаліся, што яе каханкам аказаўся... афіцэр КНБ. Справу, натуральна, хутка замялі.

Цяпер, паводле Аліева, Назарбаеў заклапочаны тым, як перадаць усю ўладу трохгадоваму сыну Султану. З гэтай мэтай прыняты план «Суперхан». У рамках ягонай рэалізацыі для поўнага гарантавання перадачы ўлады ўсе эканамічныя рэсурсы краіны павінны быць да 2030 года падпарадкаваныя прэзідэнцкім структурам.

Але ў прынцыпе пры двары Назарбаева жывецца не так ужо і сумна. Аліеў піша, як быў куратарам так званых «клоунаў» — кандыдатаў у прэзідэнты, якія стваралі ілюзію наяўнасці палітычнай канкурэнцыі Назарбаеву. Вось як ён апісвае тое, што адказаў Аліеў на загад Назарбаева знайсці яму «клоуна», і што адбывалася потым: «Прапаную Гані Касымава з мытні. Гані славіцца сваім вяр'яцкім самадурствам! Наколькі я разумеў, гэтыя якасці і патрэбны былі прэзідэнту. Назарбаеў трошкі падумаў і прапанову ўхваліў. Ён патрабаваў, каб я асабіста паразмаўляў з Касымавым, прынёс ад яго «клятву гаспадару» на паперы і скрытую відэастужку для надзейнасці. Мытніку праект спачатку не спадабаўся... Тым часам я арганізаваў яму сустрэчу з прэзідэнтам у апартаментах прэзідэнцкага палацу. Сустрэча прайшла цудоўна. Назарбаеў зацвердзіў кандыдатуру Касымава ў якасці свайго ліпавага канкурэнта, пераканаўшы Гані, што баяцца няма чаго: яго чакаюць выключна бонусы».

Самае смешнае, што падчас выбарчай кампаніі Гані Касымаў сапраўды паверыў у свае магчымасці стаць прэзідэнтам, і нават заявіў у прэсе: «Мы яшчэ паглядзім, хто на гэтых выбарах пераможа». Пасля заканчэння выбарчай кампаніі яму згадалі тую заяву і пазбавілі ўсіх пасадаў. Цяпер Гані Касымаў — адзін з лідэраў казахскай апазіцыі.

Дзіўна, аднак напрыканцы сваёй кнігі Аліеў агітуе за тое, каб у Казахстане быў створаны рэжым канстытуцыйнай манархіі. Кіруючай дынастыяй павінны быць Назарбаевы.

Як можа казаць такое чалавек, якога з-за апазіцыйнай дзейнасці без яго згоды развялі з жонкай, пазбавілі кантактаў з дзецьмі, завочна прыгаварылі да 20 гадоў турмы, і нават завялі крымінальную справу на ягоных бацькоў, не зразумела...

Усход ёсць Усход.




## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ДЖОРДЖ ЦІЛЛЕР

Вядомы ў ЗША актывіст арганізацыі *Women's Health Care Services* быў забіты ў сваім родным горадзе ў штаце Канзас. Прычынай забойства стала пазіцыя Ціллера па пытанню правоў жанчын на аборты. *Women's Health Care Services* была адной з трох нацыянальных медычных арганізацый, якія выступалі за правы жанчын перарываць цяжарнасць пасля 21-га тыдня. Сярод кансерватараў гэта лічыцца страшэнным грахом. Яны называлі Ціллера «забойцам дзетак» і даводзілі, што актывіст прымушае жанчын рабіць аборты з дапамогай псіхалагічнага ціску. Кансерватары настолькі не любілі Ціллера, што ўдзень і ўначы пікетавалі ягоную клініку. Ужо ў жніўні 1993-га ён ледзь не стаў ахвярай кулі фанатыка. Акрамя таго яго ўвесь час даставалі іскамі. Апошні рэзанансны суд над ім закончыўся ў сакавіку. Ціллера прыцягнулі да адказнасці за аборт жанчыне на 23-м тыдні цяжарнасці. Дзякуючы таму, што тая жанчына перад тым, як ісці да Ціллера, атрымала заключэнне двух дактароў пра тое, што роды будуць каштаваць ёй страты маторных функцый цела, «забойцу дзетак» апраўдалі. Аднак Скот Роўдэр, сябра радыкальнай хрысціянскай групоўкі, застрэліў Ціллера. Забойства выклікала сапраўдны шок у грамадстве. Нават арганізацыі, якія змагаюцца за забарону абортаў, выказалі спачуванне родным нябожчыка. Да спачуванняў далучыўся і Барак Абама. «Праблемы не могуць вырашацца шляхам актаў гвалту», — сказаў прэзідэнт ЗША.

### РЭДЖЭП ТАЙІП ЭРДАГАН



Прэм'ер-міністр Турцыі нарабіў шмат шуму сваёй сенсацыйнай заявай. Ён назваў праявай фашызму «дэпартацыі этнічных меншасцяў у Турцыі». Што прымусіла Эрдагана казаць такія рэчы, цалкам не зразумела. Хаця палітык ні слова не сказаў пра тое, якія канкрэтна дэпартацыі ў гісторыі краіны ён лічыць фашызмам, усе падазраюць, што мова ішла пра генацыд армян у пачатку XX стагоддзя. Магчыма, гэта выказванне нейкім чынам звязана з ростам канфрантацыі паміж кемалісцкай рэспубліканскай апазіцыяй і кіруючай Партыяй справядлівасці і развіцця, якая лічыцца ісламісцкай. На мінулым тыдні апазіцыя правяла мітынг з удзелам ста тысяч чалавек, якія выступілі за свецкі характар дзяржавы, вернасць запаветам Атацюрка. У спіс тых запаветаў кемалісты ўключаюць і цвёрдую пазіцыю, якая адмаўляе генацыд армян. Між тым, апошнім часам урад Анкары пачаў дыялог з Ерэванам наконт адкрыцця межаў. Заяву Эрдагана, магчыма, варта разглядаць як своеасаблівую атаку на адзін з кемалісцкіх пастулатаў. Акрамя таго, гэта заява можа прывесці да падтрымкі з боку ЗША і Еўропы, якія даўно выступаюць за тое, каб Турцыя прызнала генацыд армян.

### ДЭВІД ДЗЮК

Былы лідэр амерыканскай расісцкай арганізацыі «Ку-клукс-клан», якога называюць самым вядомым правым радыкалам ЗША, вырашыў пераехаць жыць у Еўропу і ў якасці новай радзімы абраў Аўстрыю. Сам інтурыст тлумачыць свой пераезд у Стары Свет выключна жаданнем займацца спортам у горных умовах. Не бачаць пакуль што праблемаў і ўлады Зальцбурга, дзе збіраецца жыць былы «галоўны рыцар» — так называецца кіраўнік «Ку-клукс-клану». Затое мясцовыя антыфашысцкія і яўрэйскія арганізацыі вельмі занепакоеныя. Усе памятаюць атысеміцкія выступы Дзюка на кангрэсе па праблемах Халакосту, які арганізавалі ў 2006 годзе іранскі ўрад у Тэгеране. Акрамя таго жонка Дэвіда ўжо мела праблемы з аўстрыйскім законам. У 2003 годзе яна была арыштаваная падчас раздачы ўлётак антысеміцкага зместу. Адмаўленне факту Халакосту разглядаецца ў Аўстрыі і ў Германіі як крымінальнае злачынства. Акрамя таго, ёсць падазрэнні, што Дзюк прыбыў у Еўропу з намерам навесці кантакты паміж правымі экстрэмістамі ЗША і Усходняй Еўропы. Так, у маі ён прыняў запрашэнне нацысцкай групы «Narodni Odpor» з Чэхіі ўзяць удзел у іх мерапрыемстве, аднак пасля быў дэпартаваны з краіны.



▸ **НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ**

# ДЗЕСЯЦЬ ГОД НАПЕРАД(ЗЕ)

## «СТУДЭНЦКАЯ ДУМКА» 1999–2009

Марыя МАРТЫСЕВІЧ



**Гэта здарылася тыдзень таму. Я вярталася дадому апошнім цягніком метро і, чакаючы перасадкі на станцыі «Купалаўская», чытала часопіс, прыхінуўшыся да борціка. Побач са мной на борціку сядзеў хлопец. То бок, «сядзеў» — гэта хутчэй апісанне яго фізічнага стану. Малады чалавек яўна лунаў у аблоках няяснага паходжання. На ім былі джынсы і шэры пінжак, з-пад якога амаль да калена звісаў аранжавы гальштук. Гальштук млява гайдаўся ў паветры, а хлопец млява пазіраў за яго рухамі.**

І раптам я адчула, што мой сусед спусціўся на зямлю. Ледзь улоўны жэст ці нейкія біярытмы гэта былі — не ведаю. Носьбіт аранжавага гальштуку нечакана сканцэнтраваўся і ўпіўся ў мяне позіркам. Прыўзняўшы галаву я, аднак, заўважыла, што позірк прыкуты не да мяне асабіста, а да часопіса, які я чытаю. Хлопец уважліва і прагна пачаў сачыць за тым, як я перагортваю старонкі. На сёмай хвіліне нашага супольнага чакання электрычкі ён нарэшце не вытрымаў і звярнуўся да мяне з фразай, якую я не чула з кастрычніка 2005 года: «*Дзевушка-а-што-вы-такое-чытаеце?*»

Я чытала нумар часопіса «Студэнцкая думка», датаваны кастрычнікам 2005 года.

Быў яшчэ варыянт, што хлопцу спадабалася менавіта я, а часопіс стаў нагодай пачаць знаёмства. Бо надта ўжо шмат распладзілася ў Мінску ўсемагчымых пікапераў (хлопцаў, якія знаёмяцца з дзяўчатамі на вуліцы дзеля спартовага інтарэсу, — я вельмі добра вывучыла іх павядзёнку, калі мы з калегай рыхтавалі для «Студумкі» матэрыял на гэту тэму). Але я выдатна ведала, што гэта не так. Так было б з любым іншым друкаваным выданнем ці кнігай, якую я магла чытаць у той вечар у апошнім метро. Я выдатна ведала пра гіпнатычную сілу часопіса, які трымала ў руках. Мяне адно здзівіла, што за чатыры гады імклівага развіцця айчыннага медыйнага рынку гіпнатычная сіла не паменшылася, а ўдзесяцярылася.

Прыехала электрычка, і мы ўвайшлі. Хлопец у аранжавым гальштуку ішоў, зазіраючы мне праз плячо, як Шурык у камедыі пра падрыхтоўку да экзамену.

### Шэры глянец

Я пачала пісаць для «Студумкі», калі мне было дваццаць. «Галоўнае, — сказалі мне адразу, — азіраціца па баках у пошуках трэндаў і граматна тырыць фічы». Некалькі хвілінаў я прабавіла, перакладаючы гэта на зразумелую сабе мову. А мне ж трэба было самой вучыцца пісаць такім чынам! На маім філфаку гэткаму не вучылі. Праца абяцала быць цікавай.

Чорна-бела-шэры глянцавы друк — фірмовая адзнака часопіса «Студэнцкая думка» ў 2002–2004 годзе (у 2005 быў уведзены трохколерны друк) — тлумачылася вельмі проста — так было танней. Але з тэхнічнай асаблівасці развілася ідэалогія. Пазбаўлены колераў друк на падкрэслена дарагой паперы ствараў неверагодны эфект спалучэння неспалучальнага. Гэтак і паводле зместу «Думка» імкнулася пісаць па-гламурнаму модна, але на тэмы ліберальныя, лявацкія, праваакцыйныя, нонканфармісцкія. Усяго гэтага — і гламуру, і нон-канфармізму — у беларускім моладзевым друку на той момант катастрафічна не ставала.

«Граматнае тыранне фічаў» адбывалася наступным чынам. Рэдакцыя была па вушы заваленая стылёвымі часопісамі, як расійскімі, так і заходнімі. Але «крадзеж» прыёмаў, тэмаў і афармлення магло заўважыць толькі напрактыкаванае ў такім чытве вока — усё нянаскае бязлітасна адаптоўвалася пад беларускі кантэкст, прыстасоўвалася да айчыннага матэрыялу, абрастала тутэйшымі прыкладамі.

Падыход да афармлялаўкі радыкальна змяніўся, калі файлы на свой працоўны комп пачаў атрымліваць дызайнер Віталік «Вітамін» Дзегцяроў — гіпнатычны эфект паперовай «Студумкі» шмат у чым яго заслуга. Поруч са мной, апроч галоўнай рэдактаркі Ірыны Віданавай і рэдактараў Міколы Шакеля і Сяргея Сахарава, працавалі Алёна Шалаева, Алеся Серада, Павел Свярдлоў, Багдан Арлоў, Антон Кашлікаў, Барыс Мікалайчык, Вольга Данішэвіч, Юлія Раўкуць — і многія-многія іншыя. Усяго напярэдадні юбілейнай вечарынкі рэдактары налічылі каля 300 чалавек, якія з 1999 па 2009 год рабілі нешта для «Студэнцкай думкі».

Рэдакцыя часта мяняла офісы, кожны пераезд суправаджаўся ўдарным суботнікам і ўпрыгожвальніцтвам нудных сценаў чарговага здымнага памяшкання постэрамі, цацкамі, вымпеламі і іншым, што цешыць маладое вока. Мяняўся і часопіс. Напрыканцы года выданне ўжо вельмі аддалена нагадвала сябе ж на пачатку года. Гэта была свядомая ўстаноўка творчага калектыву на эвалюцыю, хоць знешне ўсё выглядала форменным раздзяўбайствам. За кароткія тры гады мне ўдалося даслужыцца да сталага аўтара. Увайсці, так бы мовіць, у тусу.

### Чорная мова

«Чорная беларуская» — так, па аналогіі з «*black English*» (арго афраамерыканскіх трушчобаў) аспіранты-філолагі празвалі мову, на якой стваралася «Студумка» ў 2002–2005 гадах. Аднойчы я сутыкнулася на ганку філфака БДУ з такім аспірантам, даследчыкам рускай літаратуры — шчырым прыхільнікам «Думкі», а ў блізкай будучыні нават аўтарам часопіса. «Марыйка! — ведаючы маю далучанасць да стварэння любімага чытва закрычаў ён на ўвесь ганак філфака. — Апошні нумар — проста ўлёт. Толькі я не ўсе беларускія словы там зразумеў».

Аспірант быў дачэпісты і схільны да самаразвіцця. Ён выпісаў на паперку ўсе незразумелыя словы і знайшоў па раскладзе пяты курс беларускага аддзялення. Але там яго чакала фіяска. Без пяці хвілін дыпламаваныя настаўніцы беларускай мовы шчыра пераконвалі яго, што «лядоўня» — гэта лядовы палац. Толькі малады выкладчык, які ішоў міма, здолеў растлумачыць, што гаворка — пра «халадзільнік». Так пацішу-патроху малады навуковец пераклаў амаль усе словы. «Толькі адно засталося, Марыйка. Вось скажы мне, што такое «фардыбачысты»?» «Няма такога слова», — толькі і магла што адрэагаваць я. «Як гэта няма? Вось жа яно!» — і хлопец разгарнуў часопіс на старонцы музычных аглядаў. Мне і самой стала цікава, што за слова. Узялі мабільнік, патэлефанавалі аўтарцы артыкула. Аўтарка таксама чула слова ўпершыню ў жыцці. Набралі рэдактара. Нават праз тэлефон было адчувальна, што ў яго круглыя ад шоку вочы. Знайшлі тэлефон карэктара, сталі тэлефанаваць яму — але той быў па-за зонай досягу.

Ад сцэнкі на ганку філфаку мінула пяць год, але мы і дагэтуль не ведаем, што такое «фардыбачысты» — пошук «Гугл» выдае адзінадзіны лінк — на архіў нумароў «Студэнцкай думкі».

«Мова павінна быць бруднай», — сцвярджаў Сяргей Сахараў. Асноўнай бядой беларускай мовы на той час было (дый дагэтуль застаецца) тое, што грамадства ставіцца да яе як да святарнай каровы. Вершы, песні і ўрачыстыя прамовы — калі ласка, а булачку ў краме купіць — гэта ўжо неяк ненатуральна і амаль хуліганства, *вы мне, маладой чэлавек, тут не выпендрывайцесь.* Што ўжо казаць пра такую натуральную для любой мовы з'яву, як моладзевы слэнг, якога па-беларуску проста не існавала?

Разбаўляючы беларускія «гелагізмы» (словы, выкапаныя ў слоўніках, — вазьмі тое ж «фардыбачысты») і асноўны дасягненні філолагаў-пурыстаў-футурыстаў 1980–1990-х (вазьмі тую ж «лядоўню» ў значэнні «халадзільнік») англіцызмамі, русізмамі, паланізмамі, трасянкай ды словамі іншапланетнага паходжання, аўтары «Студумкі» дасягалі запатрабаванага эфекту — рэанімацыі кніжнай мовы да стану гутарковай. У адно цэлае разнародную лексіку і рублены сінтаксіс звязвала радыкальная тарашкевіца, якой упарта прытрымлівалася рэдакцыя. Браніслава Тарашкевіча, дарэчы, на адной з рэдакцыйных планёрак было вырашана раскруціць да рангу бацькі беларускага «олдскулу», айца нацы, «чый партрэт будзе друкавацца на беларускіх еўра» (вынікі чытай у CD № 3, 2004). Многіх выпадковых чытачоў даводзіла да шаленства новастворaная лексіка («цішотка» замест «майка», або «дзвіж» ды «экшн» у значэнні «падзея» — ці манера паслядоўна пісаць «гастрык» замест «крама» або «ніфіга» замест «нічога»), але ў той жа час у беларускай мовы з'яўляліся новыя прыхільнікі. Тыя, пра якіх яшчэ 20 год таму беларуская мова і марыць не магла.

### Белыя людзі

«У часопісе белмова была яркая, модная, вельмі лаканічная і вобразная. Каб Гай Рычы размаўляў на мове, ён бы размаўляў менавіта на такой беларускай. І за гэта «Студумцы» пашана і гонар», — так адгукнуўся на 10-гадовы юбілей часопіса яго адданы чытач Віктар Марціновіч, намеснік рэдактара «Белгазеты» і кандыдат філасофскіх навук. Але, вядома ж, справа была не толькі ў мове. Само кола тэмаў, якія падымаліся ў «Студумцы», радыкальна супярэчыла ўсяму, што ў Беларусі прынята было ствараць па-беларуску.

Ультрасучасны тон, кампазіцыя і дызайн часопіса меў пад сабой няхілую задачу — інсталяваць абноўлены светапогляд у галовы «маладых людзей з актыўнай сацыяльнай пазіцыяй» (так мы акрэслівалі сваю мэтавую аўдыторыю, супрацьпастаўляючы ёй «млявых і абыякавых да жыцця») і спрабуючы ператварыць другіх у першых). Як вам намер паказаць маладых беларускіх



Злева направа Алеся Серада, Марыя Мартысевіч, Алена Шалаева, Барыс Мікалайчык — найлепшыя аўтары часопіса «Студэнцкая думка», названыя падчас святкавання 10-годдзя часопіса 30 мая ў мінскім клубе Fabrique.

палітыкаў сацыял-дэмакратаў — сур'ёзных стылёвых людзей як тэндэнцыю развіцця палітычных думкі і стылю? Пры тым, што ў большасці насельніцтва слова «апазіцыя» выклікае асацыяцыі з паламанымі акулярамі, вясковаінтэлігенцкімі манерамі, сальнымі валасамі і расцягнутымі турэцкімі швэдрамі?

«Студумка» пісала пра сваіх Баракаў Абамаў (толькі белых) задоўга да таго, як Абама прыйшоў да ўлады. Зрэшты, чаму толькі белых — гурт «Рэха» і яго афра-шансон ад Андрэя Такіндангa трапілі на старонкі часопіса, лічы, з першага канцэрту. Пра людзей, якія грымяць у Беларусі і па-за яе межамі (драматург Андрэй Курэйчык, Святлана «Бенька» Бень, салістка гурта «*Серебряная свадьба*», паэтка Вальжына Морт і іншыя) "Думка" паспявала напісаць першай, задоўга да іх татальнай раскруткі. На «Першым музычным» толькі-толькі ўзышла зорка сексапільнай Люсі Лушчык — «Думка» абвяшчае яе «беларускім секс-інструктарам» (поруч з Уладзімірам Някляевым, Элеанорай Язерскай, Томай Лісіцкай, Дзімам Шэпелевым ды іншымі). На Элеанору Язерскую аўтары «Думкі» маліліся — шануючы яе як каралеву беларускага трэш-попсу і ставячы ў адзін шэраг з Майклам Джэксанам.

Але былі сярод герояў і простыя рупліўцы штодзённасці, якія ўвасаблялі сабой нераскрытыя дагэтуль у айчыннай прэсе бакі жыцця. Такія, як Павел Рудэня, — сляпы ды-джэй піратскага радыё, з Кунцаўшчыны. Або інваліды-вазочнікі, з якімі аўтары часопіса гутарылі пра іх жыццёвыя, у тым ліку сексуальныя, праблемы.

### Жоўтая прэса

Сексу ў «Студумцы» было як нідзе шмат — існавала негалосная квота на скандальныя матэрыялы. Карэспандэнт часопіса здымаў прастытутку ў Серабранцы, а потым апісваў гэта ў рэпартажы. Іншы карэспандэнт ледзь не зняўся ў аматарскім порна — і таксама пра ўсё распавёў чытачам. Прывабная карэспандэнтка падлавіла ў горадзе пікапераў і раскруціла іх на інтэрв'ю. Гомасексуалізм, інтымныя стрыжкі, праблема нястачы ў краіне секс-шопаў і нават свядомая адмова моладзі ад сексу як субкультурны феномен — усё гэта перыядычна з'яўлялася на «думкаўскіх» старонках.

Апроч таго, часопіс сапраўды быў студэнцкім — мы пісалі пра самыя розныя праблемы навучальнай моладзі — ад кватэрнага пытання, платы за навучанне і размеркавання да студэнцкіх суіцыдаў, шлюбаў па залёце і хабарніцтва сярод выкладчыкаў. Рабіліся агляды жыцця замежных універсітэтаў, аўтары пісалі аб «прафесіях будучыні» — тых, якія пакуль можна атрымаць адно ў дзвюх-трох кропках зямнога шару. Да таго ж, былі ўласцівыя кожнаму глянцаваму выданню агляды музыкі, кіно ды літаратуры… Сёння я не разумею толькі аднаго — як мы ўмудраліся запіхваць усё гэта на 40 старонак з ілюстрацыямі.

### Ружовыя акуляры

Аднойчы ўсё той жа Сяргей Сахараў — галоўны ідэолаг усяго, што адбывалася на старонках папяровай «Студэнцкай думкі», пайшоў на сустрэчу са студэнтамі. Падчас сустрэчы ўзнялася дзяўчына і сказала: «А мне не падабаецца тое, што вы робіце». Сказала такім тонам, які меркаваў, што часопіс не варта рабіць увогуле. Дзяўчына была чымсьці накшталт актывісткі «Маладога фронту» — яшчэ ў канцы 1990-х усемагчымая «моладзь БНФ» успрымалася як адзіная наяўная аўдыторыя для беларускамоўнага прадукту, і пад гэтую «Радзіму-Свабоду» перакройваліся ўсе эстэтычныя памкненні актуальных беларускіх творцаў. Сяргей Сахараў ускудлаціў іракезік, пачасаў вуха з завушніцай, агледзеў дзяўчынку праз свае вузкія акулярыкі і, затрымаўшы позірк на даўгіх русявых валасах і бел-чырвона-белых фенечках, адказаў: «У гэтым і ёсць асноўная задача нашага выдання — не падабацца такім, як вы».




Пасля артыкула пра гей-прастытуцыю ў Мінску (CD № 6, 2006) у пошце рэдакцыі пачалася істэрыка — некалькі чытачоў напісалі абураныя лісты: «Я чытаў вас, бо па-беларуску, — але гэта пераходзіць усе межы!!!» Рабіўся форменны цуд. Кансерватыўныя сілы беларускай культурнай прасторы імкліва страчвалі манаполію на беларушчыну.

Толькі што я адмовіла «Студумцы» ў любові да Радзімы ды Свабоды — але ж ва ўсім, што рабіў часопіс, гэтых двух складнікаў было ці не найбольш. «Студумка» была да смешнага нацыянальна свядомым і да сентыментальнага патрыятычным выданнем. Ужо сам той факт, што 19 сакавіка 2006 года на Плошчы, як ніколі на мітынгах апазіцыі, зашкальвала колькасць клубнай і багемнай моладзі, рэдакцыя смела запісала ў свае дасягненні. Відаць, нездарма падчас татальнай зачысткі прэсы перад выбарамі 2006 года, поруч з грамадска-палітычнымі і рэгіянальнымі выданнямі, улады шчыманулі і маладзевы глянцавы часопіс. Канфіскацыя CD № 10, 2005 мела цынічна-сімвалічны характар. Адбывалася яна вечарам 16 лістапада, а вядома пра ўсё стала 17 лістапада — у Міжнародны дзень студэнта.

### Аранжавы гальштук

«А дзе гэта выдаецца? Як падпісацца?» — не адставаў загіпнатызаваны хлопец. «Нідзе, — мармытала я цераз плячо. — Увогуле, першая «Студэнцкая думка» выйшла ў Заходняй Беларусі ў 1924 годзе. У 1990-я гады адраджэнская моладзь выданне аднавіла, а ў 1999-м быў зарэгістраваны вось гэты глянцавы часопіс. Але рэгістрацыю хутка адабралі. І вось я чытаю апошні нумар, наклад якога быў канфіскаваны ўладамі ў 2005 годзе». «Ого, — толькі і змог прамовіць малы, — а ў інтэрнэце?» І я моўчкі ўсунула яму кампакт-дыск з pdf-архівам нумароў «Студэнцкай думкі». «*Дзесять год наперед*, — з пазнавальным гарадскім акцэнтам прачытаў хлопец слоган на вокладцы, — Дзякуй вам. А што, зараз зусім не выдаецца?» — І я аддала яму фардыбачысты магніцік на лядоўню з інтэрнэт-адрасам *34mag.net* — па ім можна даведацца пра мультымедыйны часопіс «34», які з 2006 года па сёння выдаецца калектывам «Студэнцкай думкі».

Хлопец яшчэ раз падзякаваў і зноў уперыўся ў старонку папяровага часопіса, які я працягвала трымаць у руках. Мы пад'язджалі да маёй станцыі. Уздыхнуўшы, я ўціснула часопіс у рукі хлопцу і хутка выйшла.

Як бы актыўна цягам гэтых 10 год мы не азіраліся па баках у пошуках трэндаў і культавых асобаў для «Студумкі» — галоўным сэнсам існавання праекта былі і — выяўляецца — працягваюць быць яны, простыя чытачы — маладыя, нестандартныя і актыўныя, як гэты мой спадарожнік у метро. Няхай я нават імя гэтага выпадковага знаёмца не запыталася і, магчыма, ніколі больш не яго сустрэну, — галоўны герой гэтага партрэту пакалення менавіта ён — напару са сваім аранжавым гальштукам.

ПРАБЛЕМА

# ХОЧАШ ВЫХОЎВАЦЬ ДЗІЦЯ ПА-БЕЛАРУСКУ — ПРАЯЎЛЯЙ ІНІЦЫЯТЫВУ

**У амаль двухмільённай сталіцы Беларусі ўсяго толькі шэсць беларускамоўных школ і два сталыя беларускамоўныя дзіцячыя садкі. У абласных і раённых цэнтрах сітуацыя не менш складаная, у некаторых гарадах Беларусі нават увогуле няма беларускамоўных адукацыйных устаноў.**

Штогод колькасць беларускіх школ змяншаецца прыблізна на адзін працэнт. Паводле інфармацыі старшыні Таварыства беларускай школы Алеся Лозкі, у гэтым навучальным годзе толькі 20,9 працэнта дзяцей навучаліся ў школах з беларускай мовай навучання. Летась іх было крыху больш — 21,5 працэнта. Чыноўнікі ад адукацыі кажуць пра незапатрабаванасць беларускай мовы ў дзяцей і іх бацькоў.

«Калі мы прыйшлі запісваць ў чаргу на месца ў дзіцячы садок, — кажа маці паўтарагадовай Камілы Ляўчук Мілана Харытонава з Брэста, — то у нас нават ніхто не запытаўся, у якую групу — беларускамоўную або рускамоўную — мы жадаем аддаць наша дзіця. Чыноўнікі ўсё вырашылі за бацькоў. У Брэсце няма ніводнага сталага беларускамоўнага садка».

«Мая асабістая пазіцыя такая: калі чалавек штосьці хоча, то не будзе чакаць, што нехта створыць яму спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі запланаванага, — кажа маці дваіх дзяцей, загадчыца рэдакцыі дзіцячай літаратуры дзяржаўнага выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алена Масла. — Але тэма выхавання дзяцей, магчымасці даць ім адукацыю па-беларуску — асаблівая. Дзяржаўная палітыка краіны не скіраваная на вывучэнне роднай мовы, і таму бацькі, апантаныя гэтым, безумоўна, пакутуюць. Мая калега па працы Паліна Грынчук расказвае, што ў беларускамоўны садок на Кахоўскай, куды яна водзіць сваю дачку, бацькі прывозяць дзетак з усяго Мінска. Я назіраю за дзецьмі, якія вучацца разам з маёй дачкой Крысцінай у беларускамоўнай гімназіі, і думаю: а што далей? Добра, калі ты гуманітарый, магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю на роднай мове ёсць. А калі дзіця схільнае да матэматыкі, фізікі, то яму проста замінае тое, што ён вучыцца па-беларуску. Ва ўсіх тэхнічных ВНУ Беларусі выкладанне вядзецца на рускай мове. Выпускнік бачыць бесперспектыўнасць далейшага існавання ва ўмовах адсутнасці беларускамоўнай прасторы. А гэта ўжо пытанне таго, наколькі мова запатрабавана ў краіне».

Мілана Харытонава і Алесь Ляўчук з Брэста вырашылі выхоўваць па-беларуску сваю паўтарагадовую Камілу з маленства і адразу сутыкнуліся з праблемай: у брэсцкіх крамах няма беларускіх кніжак для самых маленькіх, сябры прывозяць іх з Мінска.

Знаёмыя падказалі сям'і, што ўжо цяпер трэба стаць у чаргу ў РАНА, каб у трохгадовым узросце Каміла магла трапіць у дзіцячы садок. Бацькі са здзіўленнем даведаліся, што ў Брэсце, насельніцтва якога перавышае 300 тысяч, няма беларускамоўных садкоў.

«Ёсць дзве групы толькі ў адным садку недзе ў мікраёне Рэчыца! — кажа Мілана. — Ад нас вельмі далёка, на супрацьлеглым канцы, куды можам дабірацца толькі «маршруткай». Чыноўніца мне прапанавала знайсці яшчэ адзінаццаць сямей, якія таксама хочуць выхоўваць сваіх дзяцей па-беларуску, і тады, з яе слоў, такую групу створаць у адным з садкоў нашага раёна. Выходзіць, беларускамоўныя дзеці патрэбныя толькі бацькам, а не дзяржаве. Ад нашай ініцыятывы залежыць тое, ці будуць у Беларусі беларускамоўныя садкі».

Мілана разам з мужам правялі сапраўдную кампанію: расклеілі ўлёткі з інфармацыяй пра стварэнне такой групы ў шматлюдных месцах, раскідалі іх у паштовыя скрыні, далі аб'яву ў газету «*Вечерний Брест*» і ў інтэрнэце, пакінулі кантактныя тэлефоны. Адгукнуліся толькі дзве сям'і.

Тое, што не атрымліваецца пакуль здзейсніць сям'і з Брэста, рэалізавала маладая сям'я з Мінска. Дар'я Каткоўская і Ігар Крэбс жывуць у сталічным мікраёне Сухарава, яны таксама хацелі аддаць свайго сына ў беларускамоўны садок. І ім мясцовыя чыноўнікі прапанавалі такі ж план дзеяння, як і Мілане Харытонавай і Алесю Ляўчуку з Брэста. Але ў Мінску, як распавяла Дар'я Каткоўская газеце «Звязда», адразу адгукнулася 50 сямей. І ўжо з верасня гэтага года ў сталічным дзіцячым садку № 570 у мікраёне Сухарава павінна адчыніцца беларускамоўная група. Усяго на гэтую справу бацькам спатрэбілася больш за 7 месяцаў.

«Гэта было цяжка, проста надзвычай цяжка! — расказвала Дар'я Каткоўская. — Чаму, калі б мы вырашылі адукоўваць нашага сына на рускай мове, дык нам спатрэбілася б усяго адна гадзіна нашага жыцця? Чаму, у гэтым жа выпадку, мы маглі б прайсці праз вуліцу і выбраць любы садок Сухарава, а цяпер ледзь не павінны былі б ездзіць праз усю Кунцаўшчыну? Гэта незразумела! У нас у краіне дзейнічае закон пра раўнапраўе дзвюх дзяржаўных моваў і права выбіраць мову навучання свайго дзіцяці, але чаму тады так шмат бар'ераў было на нашым шляху?»

Бацькоў, што выхоўваць беларускамоўных дзетак, жыццё прымушае шукаць і іншыя магчымасці, каб прапанаваць сваім дзеткам паўнавартасную беларускамоўную інфармацыю. Яны самі ствараюць у інтэрнэт-прасторы беларускамоўныя сайты. Адзін з самых вядомых — «Нашы дзеткі». Выданне мае шэраг раздзелаў і шмат карыснай інфармацыі.

Дырэктар ліквідаванага ўладамі Нацыянальнага гуманітарнага ліцэя Уладзімір Колас лічыць, што бацькам і іх беларускамоўным дзеткам яшчэ доўга чакаць лепшых часоў, хаця колькасць жадаючых вучыцца і атрымліваць адукацыю на роднай мове з кожным годам расце.

**Паводле «Завтра твоей страны»**

КНІГАРНЯ

# НА ПРЫКЛАДЗЕ СВАЙГО БРАТА

Карп КАЛЮШАЎ




**Дастаткова адкрыць сайт любога нямецкага выдавецтва, каб пераканацца — тэма вайны там не ў пашане. Адышлі ў нябыт друкаваныя ўспаміны салдат вермахта. Адпісаліся нябожчыкі гітлераўскія маршалы. Калі што і з'яўляецца на тэму вайны, то яно яшчэ і яшчэ раз праклінае нацызм. Здавалася б, кропкі расстаўленыя. Але шэсць гадоў таму адна кніга літаральна ўзарвала спакой. Яна не страціла сваёй актуальнасці і сёння. У тым ліку і для Беларусі, у чым пераконваешся, калі яе чытаеш. Зараз кніга нямецкага пісьменніка Увэ Ціма «На прыкладзе майго брата» пабачыла свет у выдавецтве Віктара Хурсіка на беларускай мове.**

Пісьменнік распавёў гісторыю сваёй сям'і і паказаў, што вінаватыя ў ачмурэнні нацызмам былі самі шараговыя немцы. Усеагульная паблажлівасць да гвалту дазваляла дыктатуры жыць.

Карл-Хайнц Цім быў старэйшым за брата Увэ на васемнаццаць гадоў. Ён запісаўся добраахвотнікам у вафэн-СС і загінуў пад Харкавам у 1943-м. З фронту ў сям'ю вярнуўся невялікі пакуначак з асабістымі рэчамі Хайнца, дзе, паміж іншым, быў і невялічкі дзённік. Запісы маладога эсэсаўца, выкананыя наспех алоўкам у час перадышкі, сталі адпраўной кропкай для разважанняў аўтара пра трагічны лёс брата, яго месцам у сям'і, у грамадстве.

Увэ Цім піша: «У адказ на пытанне, чаму брат запісаўся ў войскі СС, у маці заўсёды было напагатове некалькі самавідавочных тлумачэнняў: „З юнацкага максімалізму. Ён не хацеў быць горш за іншых. Не хацеў хавацца за чужыя спіны". Яна, як і бацька, з нязменнай дакладнасцю падкрэслівала адрозненні паміж СС і войскамі СС. Бо на той час, пасля заканчэння вайны ўвесь свет абышлі жудасныя кадры, знятыя на кіна- і фотаплёнку пры вызваленні канцлагераў, усе ўжо ведалі, як яно было на самай справе. Гэта «шайка», — так стала прынята казаць, — гэтыя «злачынцы». Аднак хлопчык якраз быў у войсках СС. «Гэта былі звычайныя баявыя часткі. Злачынцамі былі іншыя, тыя, што з СД. Так званыя часткі спецыяльнага прызначэння. А найперш тыя, што наверсе, — кіраўніцтва. Выкарысталі хлопчыка, злоўжылі яго юнацкім ідэалізмам», — тлумачыла маці.

«Спярша хлапчук, потым гітлерюгенд. Маршыроўка строем пад фанфары, ваенныя гульні, песні, аксельбанты... Былі дзеці, якія даносілі на ўласных бацькоў. І гэта пры тым, што ён, твой брат, у адрозненне ад цябе, ніколі не любіў гуляць у салдацікі. Я была супраць, казала яна, супраць таго, каб ён запісваўся ў СС».

У сваіх ацэнках аўтар не шануе нікога. І бацькі, і суседзі і іншыя жыхары Германіі ведалі пра тое, што адбываецца ў краіне. Мільёны немцаў загінулі ад паблажлівасці да дыктатуры, ад боязі супрацьпаставіць сябе ўсеагульнаму ачмурэнню, ад жадання жыць лепей за іншых...

Гартаючы старонкі гэтай кнігі, адчуваеш подых той далёкай ад нас эпохі, бачыш, як жылі і што думалі яны там, у далёкай Германіі, якая хацела заваяваць свет. І як імкнуліся апраўдаць сваю паразу ўжо пасля 1945-га, седзячы ў кавярнях ушчэнт зруйнаванага Гамбурга.

Выдатны аповед шчырага чалавека з цікавасцю будзе прачытаны і ў Беларусі.

ВЫСТАВЫ

# АД СУЧАСНАГА ДА ТРАДЫЦЫЙНАГА

Аляксей ХАДЫКА

**Прапануем чытачам прайсціся па новых экспазіцыях, якія адчынены ў мінскіх музеях.**


Карціна Пятра Асоўскага

Як звычайна, галерэя «Універсітэт культуры» (Палац Рэспублікі на Кастрычніцкай плошчы) імкнецца прывабіць канцэптуальным праектам, які яе кіраўніцтва праводзіць да Міжнароднага дня абароны дзяцей 1 чэрвеня разам з Прадстаўніцтвам ААН у Беларусі — «Бэбі-бум!».

Маладосць увасабляюць творцы, ужо вядомыя і яшчэ не, — беларускія мастакі, скульптары, дызайнеры, фатографы, а свет дзяцінства — абраная імі тэматыка: чароўнасць дзіцячых гадоў, пошук адпаведнага ўзросту бачання навакольнага асяроддзя, увасабленне гульняў, фантазіяў, творчых ідэй. І пошук праз «дзіцячую» мову нестандартных і свежых форм мастацкай выразнасці.

Святло дзяцінства — не заўсёды шчаслівае: экспазіцыю дапаўняе прапанаваны Офісам спецыяльнага прадстаўніка генеральнага сакратара ААН па ўдзеле дзяцей у ваенных канфліктах фотапраект «Дзеці вайны: разбуранае дзяцінства». Што ж, важны дадатак, хаця ў Беларусі, як і на ўсёй постсавецкай прасторы, ці не істотней была б тэматыка «Дзеці таталітарнага і посттаталітарнага грамадства». Гледачы старэйшыя за сённяшніх юнакоў прыгадалі б пятнаццацігадовай даўніны цыкл Артура Клінава «Смерць піянера».

Але ўлічваючы драматычны лёс «Падземкі», чыя выставачная актыўнасць і нестандартнасць фармулявання экспазіцыйных ідэй паставіла перад ёй непераадольныя праблемы, цяжка чакаць ад невялікіх, тым больш дзяржаўных галерэй, прэтэнзій на аналітычную рэфлексіўнасць. Таму ў светлых мроях дзяцінства шукаем пераважна станоўчааптымістычнае. Як у выставе малюнкаў 16-гадовай Марыі Коўзун «Вось яны, мае ўлюбёныя і забаўныя», што прадстаўляюць 11 гадоў сталення мастачкі ў студыі Рышарда Мая. Зрэшты, гісторыя росту творцы-пачынальніка — з дзіцяці ў маладую дзяўчыну — таксама цікавы тэматычны ракурс (галерэя «Вільнюс» на Каліноўскага, 55, па 29 чэрвеня).

У Палацы мастацтва (Казлова, 3) — змена экспазіцыі. 31 мая закрылася выстава кніжнай і часопіснай графікі «Мастак і Кніга», якая ўвасабляла сабой удалую спробу Саюза мастакоў адрадзіць колішнюю практыку штогадовых імпрэзаў ілюстратараў, якія праводзіліся з 1997 года звычайна ў звязцы з правядзеннем Мінскага кніжнага кірмашу (канцэпцыю тады распрацоўвалі Пётр Васілеўскі і Уладзімір Лукашык). Змяніла кніжную графіку выстава «Сад Венеры», што адкрылася 3 чэрвеня.

«Сад Венеры» — зварот да не самай пашыранай у беларускім мастацтве тэмы «ню», аголенасці, да аналізу фізічнага, эстэтычнага, культуралагічнага пераасэнсавання ў мастацтве чалавечага цела ў першатворнай адкрытасці. Галерысты абяцаюць прывабіць гледача вобразамі вытанчанай прыгажосці і гармоніі, і насычаных калізій. Тэма «ню» патрабуе ад творцы, пазбаўленага магчымасці скарыстаць знакавы шэраг сацыяльных і культурных прывязак у атрыбутах і дадатковых дэталях, узмацнення паэтычнасці мастацкай мовы і яе фармальнай экспрэсіі.

Галоўны Нацыянальны мастацкі музей краіны (на Леніна, 20), прываблівае чарговымі знаёмствамі з культурай блізкіх і далёкіх краёў. Творчасць Пятра Асоўскага (выстава «Рамантыка славянскіх земляў»), прадстаўніка пакалення слыннага «суровага стылю» 1960-х, збольшага вядомая гледачу: экспрэсія яркіх фарбаў і «рубленых» лаканічных форм, эстэтыка больш шчырых і простых вобразаў, народжаная хрушчоўскай адлігай. Сёння: адчуванне спецыфічнага духу «агульнаславянскай» з'яднанасці, у межах мастацкай «паліткарэктнасці», але не без адчування духу вялікай палітыкі.

Затое «Традыцыйнае мастацтва Карэі», прадстаўленае па ініцыятыве амбасады Рэспублікі Карэя і падтрымцы Дзяржаўнага музея этнаграфіі гэтай краіны — падарожжа ў далёкі і нязнаны край.

Творы будысцкага жывапісу і скульптуры, вынік пераасэнсавання рэлігійных прынцыпаў на нацыянальнай глебе. Узоры першага ў свеце разборнага металічнага шрыфту XV стагоддзя (азбука Хангыль), створаныя па ўказе правіцеля краіны караля Сечжона ад 1443 года.

Мастацтва керамікі высокага тэхналагічнага ўзроўню, запазычанае з Кітаю, але пераўвасобленае на свой эстэтычны лад: разнастайныя формы, нестандартны дэкор. А таксама выдатныя творы дэкаратыўнага мастацтва, інкрустацыя перламутрам, бычыным рогам, металічныя вырабы.

Дадайце паказаныя копіі жывапісных работ прафесійнага майстра побытавых, жанравых, анімалістычных, рэлігійных сюжэтаў і партрэтаў Кіма Хонда (1745–1806) — энцыклапедыю жыцця Карэі XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Каля 30 работ, копій твораў класічнага карэйскага мастацтва, перадаецца ў падарунак Мастацкаму музею Беларусі. Як не прыгадаць дыскусію на нядаўніх чытаннях у гонар 100-годдзя шматгадовай дырэктаркі Мастацкага музея Алены Аладавай пра неабходнасць стварэння якасных копій з беларускіх ікон, старых партрэтаў — хоць бы дзеля экспанавання ў сваіх правінцыйных музеях або дзеля вяртання пазык беларускім храмам. Капіраванне — гэта і пашырэнне, зберажэнне культурнай традыцыі.


Экспазіцыя выставы карэйскага мастацтва

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 5.06.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.